Новы Час | 28 верасня 2018 | № 35 (598) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №9

Літаратурная Беларусь

Выпуск №9 (145)
(верасень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»
lit-bel.org
novychas.by

Змест

«Паміж крывавых вех»

Курапаты

Алег ЛОЙКА

1
«Чорны воран», чорны, кляты,
Пад'язджаў пад Курапаты.
Перад ім, як чужаземка,
Фыркала бензінам «эмка».
Ды зусім не чужаземцы
Ехалі ў віхлястай «эмцы».
Бартавы пазвязгваў шворан:
Разгружаўся «чорны воран»,
Кат рупліваў на зарплаце
(Норму перавыканае —
ордэн адхваціць):
«Станавіся!..» — роў стакраты
І —
ні слова лішняга, —
Не з міндальнічання калішняга
Курапаты...

2
«А людцы ж мае, а Божа!..» —
Людзей не ўспамінаць
калгаснік з-пад Слуцка
не можа,
Ды аглушаны ўшчэнт Курапаты:
Расстрэлы год пяты,
І не да літання кату:
«Калі ты — тут, значыцца, —
вінаваты!..»
Вінаваты кожны, хто не баіцца,
У вачах каго — сляза спачування
іскрыцца,
Хто не стукач, не падслухач-падлюга —
Даносаў поўная глюга!..
Жывеш без дрыжання, без страху,
Ды пад уласным дахам?..
Уласнік! Кулак!
Сотаму закажаш, баяцца трэба як!..
Цябе падмануўшы,
Зямлю забраўшы, свабоду, —
Ты не баішся, — цябе баіцца
Бацька народаў;
А што, як запрагнуць адплаты,
Дык лепш — у яму:
Прымайце, Курапаты!
Прымай, зямля,
Калі яны цябе любяць!..
Бо што, як касу назубяць?!
Косы ж кляпаць умеюць,
Рукі маюць,
ходзяць, глядзяць, разумеюць.
Жонак маюць, дзяцей, хату,
Ды яшчэ беларусы...
Вінаваты!
Вінаваты, што рэвалюцыяй, Леніным
хрышчоны,
Што ўвогуле нараджоны,
Кожны — вораг народа свайго закляты,
Вінаваты!
Ці хопіць яшчэ на іх Курапатаў?!

1990-я гады

Крыжы

УЛАДЗІМІР НЯКЛЯЕЎ

29 чэрвеня 2018 года былі арыштаваныя крыжы, якія беларусы везлі ў Курапаты, каб абараніць Нацыянальны мемарыял ад нячыстай сілы.

Арыштаваныя крыжы.
Нябесны Ойча, адкажы,
Ці час нам брацца за нажы,
Ці падстаўляць шчаку другую,
Як падстаўляе з года ў год
Яшчэ няспраўджаны народ,
Што сам з сабою варагуе?

Даруй нам, Божа. Не карай.
Хай сам сябе знішчае край
Той родны кут, што так нам мілы,
Дзе ў храмах молімся чужых,
Дзе мёртвым сорамна за тых,
Хто зневажае іх магілы!

Даруйце нам, дзяды, бацькі...
Хай вам баляць, пякуць цвікі,
Якімі вы раскрыжаваны,
Хай Беларусь, уся ў слязах,
Пакуль мы таньчым на касцях,
Галосіць, ліжа вашы раны!

Няхай паміж крывавых вех
На здзек сыходзіць і на смех
Усё, што стала нашай доляй,
І хай знямее той народ,
Няхай той род ідзе на звод,
Які не заручыўся з Воляй!

Даруй смяротны грэх, Гасподзь!
Хай век не скінуць нам аброць,
Хамут, што самі мы надзелі!..
Хай прахам стануць дух і плоць,
Але пакінь надзею хоць,
Пакінь мне, Госпадзі, надзею...

29.06.2018,
Курапаты

Курапаты

Анатоль ДЭБІШ

1. Аблога
Ноч халодная... Крыкі і крокі,
Хтось нябачны стаіць за акном,
Нехта змрочны, чужы і высокі
Аж да рання вартуе мой дом.

У пакоі — адзін я. Лагодна
Зззяе ветах на небе... Маўчу...
І, прамоклы, худы і галодны,
Безупынку за госцем сачу.

Хвілі часу — бы вострыя спіцы.
Жахам ноч маё поўніць жыццё,
І нябачная вокуігліца.
Упіваецца ў сэрца маё.

2. Уцёкі
Я, знямоглы, паўзу праз туман
Да святочніца айчыннай дубровы.
І струменіцца кроў з маіх ран
На імхі і на дол вечаровы.

Жаўрукі не пяюць нада мной.
Толькі мне паміраць яшчэ рана.
Я стаміўся жыць праўдай чужой
Пад уладай забойцы-тырана.

Ды бліжэй да мяне ўсё тыран,
Чую подых яго нада мною.
Я, знямоглы, паўзу праз туман...
Дзень гарачы сплывае крывёю.



Фота www.narodny.org

3. Пакаранне
Смерці выбраннік, ляжу я на пласе самотны,
Молячы Бога, каб даў мне цярпенне і сілы
Цвёрда ступіць у хаўрусную цемру магілы,
Жахі і роспач змагчы ў гэты
час мой смяротны.

Дзень адплываў, дзень агнём дагараў
незваротны.

Чуліся гукі трубы, пахавальныя спевы
Хору дзяўчат маладых...
Вецер прагна разносіў
Спеў іх дзівосны па вулках... І гордая восень
Вецце зрывала, у злосці ламаючы дрэвы.

Чуліся крыкі праклянцця, надзеі і гневу.

Даў бы хто крыж — цалаваў бы за маці і веру.
Ды не пачуюць. І кроў на зямлі запяклася...
Не, не мая, а чужая. Увіву я сякеру,
Што ў гэты міг над маёй галавой узнялася.

Я не адзін, нас мільёны ляжала на пласе.

Млосна зрабілася. Вусны мае задрыжалі.
«Гэта — усё...» Мітусіліся роспачна мроі...
З жаху прачнуўся я, кінуўшы коўдру і шалі
Прэч ад сябе... Гэта ж я ахвярую сабою.

Светла і ціха было ў халодным пакоі.

Я падышоў да акна... Залацілася восень.
У хованкі дзеці ў парку забаўна гулялі.
Дзед мой прыпомніўся мне...
Каляндарны лісток... 38 —
Год ракавы... Мы вяртання яго доўга чакалі.
У трыццаць восьмым — яго расстралялі.
...
Смерці выбраннік, ляжаў на смяротнай
я шалі.
<...>

6. Суд
...І калі раскапаюць травою
зарослыя ямы —
Выйдуць змрочныя здані да сонца
з халоднай зямлі.
Загалосяць яны, зазвіняць
на ўвесь свет кайданамі
І папросяць у Бога,
каб ка́таў на суд прывялі.

Сотні, тысячы сотняў, мільёны
нявінных ахвяраў,
Што здабычаю сталі зняваgi
і дзікай маны...
І збялеюць у катаў і ў служак іх
сытыя твары,
І папросяць збавення
і літасці ў Бога яны.

Ды адкажа ім Бог: «...Не суддзя вам...
Вось вашыя суддзі.
Ім ваш лёс вырашаць, ім —
над вамі чыніць свой прысуд...»
Нехта крыкне з натоўпу:
«Даруйце ім, добрыя людзі!..»
...І даруе, усё ім даруе падмануты люд.

Скрушны матыў курапацкі

Васіль Жуковіч

Есці і піць ля касцей,
Як падаецца мне, —
Цешыць ліхіх чарцей,
Не! —
дагаджаць сатане!

Хто рэстаран адчыніў
Ля курапацкіх крыжоў,
Той людзям боль прычыніў,
Каяцца хай бы прыйшоў!

Трэба сумець не смець
Ганьбу сеяць і жаць,
Дзе лютавала смерць, —
Там, дзе ахвяры ляжаць!

Бацька крывавых спраў —
Грозны крамлёўскі кат
Процьму чыніў расправ —
Шмат учыніў КУРАПАТ.

Цень бяспамяцтва, згінь!
Я паўтару ўсім нам:
Горкіх сваіх святынь
Не аддавайма псам!

Лета 2018 года

Уладзімер Арлоў. «Паручнік Пятровіч і прапаршчык Здань»

Памятаеце тэорыю нелінейнага часу? Не існуе мінулага і будучыні. Ёсць толькі бясконцае палатно з кропкамі — усімі падзеямі, што быццам былі і будуць. Быццам — бо ўсё адносна. Найперш — адносна вашага становішча на палатне.

У грузінскай баладзе Уладзімер Арлоў піша:

Гвірабі вяртае ў іншы час
тады свой час ствараў ты сам
выдзьмуваў час
вясёлкавымі мыльнымі пухірамі
мелодыяй трысняговай дудачкі
трапяткой куляй на экскурсіі ў гуце
чамусьці ты думаў:
твой час нараджаецца ад твайго дыхання
для полацкага мальца зусім няблага

Полацкі малец вырас, але не пакінуў надзею кіраваць часам. У кнізе «Паручнік Пятровіч і прапаршчык Здань» ён збольшага тым і займаецца, што вольна перасоўваецца па бясконцым палатне. Пераскоквае з купіны на купіну, а вакол — твань забыцця.

Следам крочаць прывіды. Уласна, гэта і ёсць Пятровіч і Здань. А яшчэ Францішак Скарына, Ціт Лівій, Віслава Шымборска, Стэндаль, Актавіян Аўгуст, Данатэла і Дантэ, Адам Міцкевіч, Лютар, Борхес, нават Хрыстос з Пілатам... Пералік далёка не поўны.

Адны з іх прыйшлі ў тэкст выпадкова. Яны ажылі праз судакрананне аўтара з месцам, якое захавала сляды даўно спачылых людзей. Іншыя здані былі з Арловым заўсёды. Гэта рэальныя людзі, якіх у часавых каардынатах аўтара больш няма. Яны ў іншых кропках. Мы гэта завем іншасветам.

Але як такога іншасвету ў Арлова не існуе. Так, ён іранічна разважае пра тое, што ў пекле цікавая кампанія і ўвогуле добрая інфраструктура... Але і гэты, нібыта рэальны свет, і той, нібыта прыдуманы, існуюць на роўных.

Крытыкі, якія разважалі пра папярэднія паэтычныя кнігі Арлова, прыпісвалі гэтую рысу: рэальнасць прывіднага, прывіднасць рэальнага — магічнаму рэалізму. З тым жа поспехам можна сцвярджаць: Уладзімер Арлоў — ідэаліст. То бок прыхільнік вучэння Платона пра свет ідэальны і матэрыяльны. Ідэя першасная, і нават калі яе матэрыяльнае ўвасабленне будзе знішчанае, сутнасць рэчы застанецца непарушнай...

І што цікава: патаргванне ніткі памяці не проста ажыўляе персанажа, але робіць яго галоўным героем. Ён перахоплівае аповед. Становіцца на месца аўтара.

І сам торгае за нітачку ўспамінаў.

Так разгортваецца складаная сетка сувязяў паміж рознымі фрагментамі тэксту. У кожнай баладзе ёсць нешта накшталт сюжэта. Ёсць дзеянне ў часе аўтара, паралельна — дзеянне ў свеце «прывідаў». Часы перагукаюцца. Арлоў рэзануе з мінулым, з сугучнымі асобамі. Напрыклад, Бальтазар з полацкай балады, які жыве адначасова ў старадаўнім княстве і ў сучасным Полацку. Гэтая балада — пра тое, як няпроста быць катам. «Аркады Падуі» — пра вандроўку ў насычаны гісторыяй горад. Эратычныя прыгоды таксама ёсць. «Мёд» — пра дзяцінства і лёсы сяброў. «Алека» — пра паездку ў Балгарыю. І г.д.

Безумоўна, усе гэтыя «пра» — вялікая-вялікая ўмоўнасць. Сам Арлоў выдатна праілюстраваў абсурднасць спробы ўсталяваць хоць якое «пра»:


паэтка Ольга просіць прачытаць
твой улюбёны верш
о Радзіма мой светач цудоўны адзіны
явар мой мой агністы снягір на сасне
ледзь цябе не забыў я з чужою жанчынай
што ў душы не хацела і ведаць мяне

пра што верш?
верш пра снегіра
такая птушачка з чырвонай грудкай

Да пытання жанру. Аўтар з літасці пазбавіў тэарэтыкаў літаратуры галаўнога болю, пастанавіўшы: гэта балады. Раней адны называлі яго паэзію вершатэкстамі, іншыя — паэтычнымі эсэ. Кожнае з азначэнняў мае права існаваць, а гэта значыць — ніводнае не мае сэнсу.

Балады Арлова — гэта спрэс асацыяцыі, сімвалы, шырокая геаграфія, перанаселенасць, і ўсё аздоблена іроніяй... Але найбольш уражвае не эрудыцыя аўтара ці паэтычны досціп, а ўменне ўпарадкаваць хаос, які творыцца наўкол і адбіваецца ў паэзіі Арлова. Здаецца, ён адразу скарыўся хаосу. І хаос адказаў тым жа. Як дзікі звер, які адчуў, што яго не збіраюцца прыручаць, заспакоіўся і дазволіў даследаваць сябе. Ад пухнатай і мяккай грывы — да смертаносных іклаў.

І аказалася, што яны аднолькава прыгожыя.



хто гэта сказаў пра час:
мы тут былі і адбыліся?
маўляў мілы прытулак
пяшчотны і эфемерны
твой варыянт пазбаўлены
лірыкі:
былі і не адбыліся
развеяліся ў экзістэнцыйным тумане
у мілым пяшчотным прытулку
дзе над ложкамі схіляюцца
пачвары і дэманы

Застаецца адкрытым пытанне: чаму ў любым творы Уладзімера Арлова абавязкова прысутнічае жанчына?

Зразумела, ёсць катэгорыя пісьменнікаў, якія ва ўмоўным узросце «за пяцьдзясят» маніякальна апісваюць эратычныя перажыванні (сублімацыя на сублімацыі). Але Арлоў не з гэтых шэрагаў. Датычна паэта-інтэлектуала такое тлумачэнне было б, мякка кажучы, прымітыўным.

І яшчэ пытанне: дзеля чаго ўсё-такі гэтыя шэрагі ценяў, паўсюднае ўваскрашэнне прывідаў? Няўжо для стварэння т.зв. «еўрапейскага кантэксту»?.. Ці адно з павагі да спачылых калегаў па пяры? Паэзія, паэзія, *твой арганізм атручаны паэзіяй да самых карэньчыкаў валасоў*


...Адказ аказаўся простым. Анталагічным, можна сказаць.

І літаратура (гэта значыць, творчасць), і жанчыны (што значыць — каханне) у свеце мужчыны пакліканыя перамагаць Смерць.

Цяжка паверыць у гэта, перачытаўшы сакавітыя гімны жыццю, але ўсё да таго: у аснове кожнага верша Арлова — той самы першабытны страх. «Паручнік Пятровіч і прапаршчык Здань» — гэта вялікая барацьба са Смерцю. Змаганне з непазбежным, спробы зацугляць час. Таму Арлоў так пільна ўзіраецца ў твары вялікіх, так часта іх згадвае. Пры тым, што кніга пакідае па сабе вясёлае ўражанне (збольшага — за кошт гумару), у ёй багата сцэнаў, дзе Смерць правіць баль.

Надзвычай важна, што ўсе прывіды, якіх Арлоў перанёс у сучаснасць, мужчынскага полу. Калі ж размова ідзе пра жаночага персанажа, Яна перанараджаецца (чытайце «Вуліца Саламеі»). Усё тлумачыцца старой тэорыяй, згодна з якой мужчыны дасягаюць несмяротнасці праз Подзвіг. У нашым выпадку — праз літаратурны геній. Што да жанчыны, яна жыве ў дзецях (тое ж перанараджэнне).

Няўжо толькі пра страх смерці гэтая кніга? Вядома, не. У кожным радку гэтаму страху супрацьстаіць жыццё. А галоўнае — сам Уладзімер Арлоў. Як належыць, з адкрытым забралам.



Пятро Васючэнка. «Дзівоснае лета паноў Кубліцкага ды Заблоцкага»

...Вы бачылі хоць адну значную дзіцячую кнігу, якая не мела б схаваны мэсэдж да чытача «дарослага»?

Дзіцячых пісьменнікаў, мне здаецца, увогуле не існуе. Ёсць проста пісьменнікі, якія пры наяўнасці адпаведнага жадання ствараюць рэчы, цікавыя адначасна дзецям і дарослым. І ёсць кепскія аўтары, якія пішуць рэчы прымітыўныя — толькі з тае нагоды, што дзеці бачацца ім гэткімі ж прымітыўнымі істотамі...

Новая кніга Пятра Васючэнкі «Дзівоснае лета паноў Кубліцкага ды Заблоцкага» мае некалькі прывабных (яны ж вызначальныя) рысаў: у яе арыгінальны сюжэт; яна вясёлая; яна напісаная мовай, якая сапраўды існуе, а не выводзіцца ў інкубатары.

Але самае значнае — узрост магчымага чытача. Ён неабмежаваны. Чытаць яе можна ад таго самага моманту, калі ты ўласна навучыўся гэта рабіць, і да таго часу, пакуль не перастанеш чытаць... з тэхнічных прычынаў.

Калі казаць пра дзяцей, іх у казцы Васючэнкі найперш «зачэпіць» сюжэт. Самае галоўнае — тут ёсць падарожжа з прыгодамі. Гэта значыць — заўжды трымаецца інтрыга. Як жа складаную сітуацыю вырашыць герой?.. Кожны раздзел мае такую мікрапраблему, кожны раздзел — асобная гісторыя з завязкай і развязкай.

Наступны «кручок» — тэмы. Першая частка казкі, уласна да падарожжа паноў, напоўненая ўсялякай жыўнасцю. Пачынаючы ад планктону ў сажалцы — заканчваючы дзівоснымі мутантамі (Жук-і-Жаба, напрыклад). У казцы з'яўляецца персанаж, якога дзіця будзе ўспрымаць як роўнага (праз узрост персанажа) — юны натураліст Максім. Ён прыўносіць у сюжэт мастацкі вэрхал, а яшчэ — педагагічную хітрасць. Не ведаю, ці яна спрацуе, але: праз Максіма аўтар прамаўляе пра значнасць усякай жыўнасці на планеце. З аднаго боку — справа высакародная, ніякіх сумневаў. З іншага — гэтая частка аповеду прапарцыйна выбіваецца з казкі. Гісторыя пра Максіма (ці не з Дарэла ён спісаны?..) і экапытанні маглі спакойна скласці асобны твор.

Што асабліва цікава: пытанне пра роўнасць і братэрства між людзьмі і астатняй жыўнасцю паўстае ў творах Пятра Васючэнкі не ўпершыню. Той жа кумір Максіма, Карл Лінэй, патрапіў у назву зборніка вершаў «Піраміда Лінэя». Некалькі раздзелаў з «Дзівоснага лета...» і ўся «Піраміда Лінэя», у прынцыпе, пра адно і тое ж.

Улюбёны прыём Пятра Васючэнкі менавіта ў гэтай казцы —ператвараць фразеалагізмы, ці іншыя ўстойлівыя выразы, у рэальныя сітуацыі. Так ствараюцца парадоксы, атмасфера вясёлага абсурду. Напрыклад, матэрыялізуюцца Піліп з канапель і Макар са сваімі цялятамі.

Калі ад веку непарушныя, застылыя ў свядомасці выразы ажываюць, пачынаюць рухацца і прамаўляць ад сябе, — апрача смеху ўзнікае адчуванне злёгку жудаснае. Магчыма, праз тое, што прыходзіць разуменне: мова і сэнсы могуць жыць асобна ад чалавека. Чалавек не гаспадар нават тым сэнсам, якія прадукуе сам.

Каб ацаніць жарты аўтара, трэба іх, зразумела, убачыць. А для гэтага, у сваю чаргу, трэба мець базавыя веды ў беларускай культуры, асабліва што датычыць мовы. Перакласці гэтую казку на іншую мову будзе гэтак жа складана, як перакласці паэзію Барадуліна.

Пры ўсім пры тым у аснове казкі (прынамсі, другой часткі) — архетыповая мадэль, у цэнтры якой знаходзіцца матыў падарожжа. Герой атрымлівае выклік (паны задаюцца пытаннем пра сэнс жыцця) — выпраўляюцца ў шлях — фінал (найбольшае выпрабаванне, адказы) — пагібель — уваскрэсенне — узнагарода (распаўсюджаны варыянт — жаніцьба).

У «Дзівосным леце...» ўзнагарода падвойваецца: да вясельнага матыва далучаецца сюжэт пра пераўтварэнне пачварыны ў «прынца». Вядома, праз каханне.

Для чаго я зрабіла гэты нудны разбор?.. Каб паказаць, як на ўніверсальнай мадэлі казкі дзякуючы адной толькі мове можа вырасці непаўторны твор. А таксама — што казка мадэлюе сусвет, шыфруе ў просценькім аповедзе асноўныя правілы існавання. Пра што Пятро Васючэнка таксама любіць паразважаць, і гэта можна заўважыць у саміх «Дзівосных прыгодах...».

Зрэшты, ён пра гэта не толькі разважае. У «Дзівосным леце паноў Кубліцкага ды Заблоцкага» таксама ёсць свае дэміургі. Ёсць, скажам так, Сіла, якая застаецца незаўважнай воку, але выдае сябе напрыканцы. Па-першае, гэта Той, хто казаў, — персанаж, які напачатку ўспрымаецца камічна, а пасля ператварае казку ледзьве не ў прытчу. Другі такі «герой» — Зорны Ровар.

І апошняе «назіранне». Чым дольш чытаеш казку, тым больш упэўніваешся, што вось гэты «закадравы» смех аўтара, гэтую іронію ты ўжо недзе чуў. Ужо гучалі пытанні пра сэнс быцця — у камічнай абгортцы; ужо выпраўляліся на пошук адказаў героі-авантурысты. Нават Зорны Ровар з выхадам у гіперпрастору нешта нагадвае...

«Што яно і адкуль яно, дзе пачатак і дзе канец, і дзе сярэдзіна быцця?..» Карацей, «галоўнае пытанне жыццця», адказ на якое быў агучаны ў рамане Дугласа Адамса. «Аўтаспынам па галактыцы» і «Дзівоснае лета паноў Кубліцкага ды Заблоцкага» гучаць у адной танальнасці. Я б нават сказала, надзіва гарманічна. Шлях да іранічна-горкай філасофіі дзіцё можа пачаць якраз з Васючэнкі — а там і да Адамса дойдзе.

Галоўнае — не ўспрымаць усё надта ўсур'ёз. Ці мала што...

Наста Грышчук

Лірычны герой паэзіі Ніны Мацяш

(Да 75-годдзя з дня нараджэння паэтэсы)

Асоба паэта звычайна асацыіруецца з лірычным героем яго твораў. Але ці правільны такі падыход? Ці супадае па характары, паводзінах у жыццёвых варунках асоба аўтара з учынкамі лірычнага героя? А ўвогуле — хто ён, лірычны герой паэзіі Ніны Мацяш?



Перачытваў паэтычныя творы Ніны Язэпаўны, і мне падалося, быццам бы сярод іх ёсць вершы... скажам так — не зусім беларускія і нават зусім не беларускія. І мяне зацікавіла, хто ж у гэтых вершах лірычны герой. Ад чыйго імя Ніна Мацяш стварае паэтычны вобраз?

Дзеля прыкладу — даволі просты на першы погляд верш «Расчараванне». Напісаны ён у далёкім 1969 годзе. Спытаеце, а ў чым яго небеларускасць, чым верш вылучаецца ў шэрагу іншых? Ды хоць бы для пачатку — апісаннем горнага пейзажу, на фоне якога разгортваецца дзеянне. Скалістыя горы, якія зусім не характэрныя для нашага раўніннага ландшафту. Калі казаць пра сюжэт твора, то ён даволі просты: горы, сцежка, з-пад нагі ў любы час можа выслізнуць каменьчык. А калі ўсё ж выслізне, то пры падзенні сутыкнецца з іншымі. І каменная лавіна будзе грукатаць уніз, да долу. А потым стане ціха-ціха. Расчараванне — як абвал.

Расчараванне

Расчараванне — як абвал.
Хіба ўгадаеш гэта ліха?
Уцёк каменьчык з-пад нагі,
За ім знянацку і другі,
Чацвёрты, восьмы... Шчэ імгненне —
І вось пад кручу ўжо, уніз,
Лавіна груку і камення!
Галёкне рэха ў катлавіне,
Заб'ецца спуду ў стромах сініх,
І раптам стане ціха-ціха...
Расчараванне — як абвал.

Можна меркаваць, што для большасці чытачоў, аматараў паэзіі Ніны Мацяш, гэты твор — удалае параўнанне стану расчаравання лірычнага героя з каменяпадам у гарах. І калі не спрабаваць разгадваць глыбінны сэнс выказаных думак, то сапраўды можна заўважыць гэтую ланцуговую паслядоўнасць расчаравання чалавека ў нечым. І яшчэ можна апісаць каменяпад формулай матэматычнай прагрэсіі альбо знайсці падабенства з ланцуговай ядзернай рэакцыяй. Гэта калі паспрабаваць паэзію «праверыць алгебрай». І праверка ні ў якім разе не прыадкрые сакрэтны механізм нараджэння Паэзіі, які насамрэч невядомы нават і самому Паэту. Бо вершы, у гэта верыцца, не пішуцца, а толькі запісваюцца пад дыктоўку з нябесных вышыняў.

Але чаму ўсё ж горы? Быццам бы Ніна Мацяш ніколі не была ў гарах... Гэта калі прымаць пад увагу фізічную абмежаванасць паэткі. Між тым старэйшая родная сястра Ніны Алена Літвінчук сцвярджае, што ў 14-гадовым узросце будучая паэтэса ўсё ж такі была ў гарах Сярэдняй Азіі. Але, прынамсі, я не ўпэўнены, што спадарыня Ніна ў тую паездку набыла хоць які вопыт рухацца вузкімі горнымі сцежкамі. Хоць, безумоўна, вобразы горнага краю маглі адбіцца ў дзіцячай памяці.

Верш «Расчараванне» быў напісаны паэткай ужо ў сталым узросце — у 26 гадоў. Выкажу здагадку, што менавіта пад канец 60-х у Ніны Мацяш маглі ўзнікнуць глыбокія расчараванні, звязаныя з тым, што бацька (зноў жа са слоў Алены Літвінчук) адмовіў хлопцу, які прасіў руку і сэрца дачкі, а хвароба перакрэслівала надзею на сямейнае шчасце.

А што горы?.. Вядома, што рухацца праз іх можна не толькі патаемнымі сцежкамі, але і даволі-такі ўладкаванымі дарогамі. Прычым дарогай і бяспечней, і хутчэй. Тут можна сустрэць спадарожніка, які паспагадае і суцешыць, калі ты расчараваны ў каханні альбо сяброўстве. Але аўтар чамусьці выбірае для лірычнага героя менавіта горную сцежку, на якой існуе небяспека сарвацца ў бездань, на якой цяжка размінуцца з сустрэчным.

Горная сцежка не пачынаецца ад вялікай дарогі, а ўзнікае раптам ля самой гары. І таму без праваднікa ў першы раз на яе не патрапіш. Значыць, лірычны герой быў падрыхтаваны да магчымага расчаравання. Яно было «абвальным», але не неспадзеўным.

Нехта адмахнецца: «Герой выбірае горную сцежку, а не дарогу, бо так трэба для верша, для драматызацыі сітуацыі».

Дык з якой прычыны лірычнаму герою трэба было некуды рухацца так таемна, каб нікога на сваім шляху не сустрэць, ступаць так асцярожна, каб не «ўцёк каменьчык з-пад нагі»? З рызыкай сарвацца ў бездань і загінуць. З рызыкай выдаць сваё месцазнаходжанне незнарочным каменяпадам. Але і з магчымасцю адхіліцца ад сцежкі і зліцца з камянямі ў выпадку непажаданай сустрэчы...

І калі маюць месца такія меры перасцярогі, то можна меркаваць аб пераследзе, аб пагоні. І раптам заўважаеш, што стан расчаравання паказаны ў вершы не проста праз хаду па горнай сцежцы, а праз уцёкі.

Але ўцёкі куды? Той, хто ступіў на горную сцежку, першасна ведае, куды яна прывядзе. У вершы, думаецца, паказаны не толькі ўцёкі ад пераследу, але і... калі гаварыць юрыдычнымі тэрмінамі, спроба эміграцыі ў іншую краіну. Што ж магло паслужыць прычынай для такіх дзеянняў? І хто ён тады, лірычны герой? Тое, што лірычны герой знаходзіцца ў шэрагу людзей, над галавою якіх занесены меч, якія падлягаюць знішчэнню, відавочна.

Толькі ў чым можна было расчаравацца да такой ступені, што трэба было ратавацца ўцёкамі ў іншую краіну. У сябрах? У каханні?

Amo te

Amo te, ama me, fides immortales» — «Кахаю цябе, кахай мяне, вернасць несмяротная», — пісалі старажытныя рымляне на заручальных пярсцёнках.

З Рыма, з даўніх давён,
Праз стагоддзі-вякі,
У абрадавым звоне крыштальным
Прыкаціўся пярсцёнак
Да жаночай рукі,
Прыкаціўся пярсцёнак
Да мужчынскай рукі, —
Amo te,
Ama me,
Fides immortales.

Блаславіў Гіменей,
Абяцаў Гіменей
Сонца, шчасце раскрыленых даляў.
І выстукваюць сэрцы
У цябе і ў мяне:
Amo te,
Ama me,
Fides immortales.
<...>

Несумненна, гэты верш пра каханне і пра шчасце. Напэўна, спадарыня Ніна марыла пра вяселле. Я помню, як і праз два дзясяткі гадоў яна натхнёна чытала гэты твор на сваіх творчых вечарынах. Але літаратурныя крытыкі чамусьці не звярнулі на яго належнай увагі. Мо былі зачараваныя паэтычным словам? Хто ведае. Дык пра што ж гэты верш? Скажу адразу: ён не пра беларускае і не пра сучаснае вяселле. Першыя словы — «З Рыма...» — адразу адсылае чытача ў Ватыкан. Папаў Рымскіх было шмат, але Ніна Мацяш указвае перыяд часу — «праз стагоддзі-вякі», — у якім мог правіць нейкі канкрэтны Папа Рымскі. А калі алічбаваць словы, то атрымаецца перыяд часу ад 200 да 900 гадоў.

Пра каго напісаны гэты верш? Вядома, што Папа Рымскі не абслугоўвае праваслаўных, а толькі каталікоў. У дачыненні да Беларусі гэтая акалічнасць «падзяляе» краіну на дзве вялікія часткі, адна з якіх, калі можна так сказаць, застаецца «па-за вершам». Да таго ж Ватыкан не абслугоўвае і звычайныя вяселлі, а толькі вяселлі асобаў каралеўскай крыві. Яшчэ можна з упэўненасцю сказаць, што ў вершы апісваецца вяселле караля, і ні ў якім разе не князя альбо нейкага цара. А пра вяселле якога ж караля можа ісці гаворка?

Тут узнікае здагадка: Мацяш — гэта сапраўднае прозвішча паэтэсы, а не псеўданім. Самы вядомы «ўладальнік» гэтага прозвішча — вугорскі кароль Маціяш. Кароль Маціяш нарадзіўся за 500 гадоў да нараджэння Ніны Мацяш — у 1443 годзе, праўда, не 20 верасня, як Ніна, а 23 лютага. Паміж Вугоршчынай і роднай вёскай паэтэсы Нівы Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці з гор — толькі Карпаты.

І падобна на тое, што ў згаданым вершы апісваецца вяселле караля Маціяша з Катарынай Падэбрад (Кунінгай), дачкой чэшскага караля Іржы Падэбрада ў 1463 годзе. А 8 сакавіка 1464 года пятнаццацігадовая жонка памірае пры родах, а праз дзве гадзіны памірае і народжаны сын...

А як там жыве кароль Маціяш Корвін? Аказваецца, па-ранейшаму ў яго няма законнанароджаных нашчадкаў. Але ж «каралі могуць усё», ды толькі не жэніцца па каханні. Аказваецца, у караля Маціяша быў сын Янаш, названы ў гонар бацькі караля Маціяша Яна Хуньядзі, вядомага военачальніка, які спыніў асманскае нашэсце на Еўропу і быў нават рэгентам Вугоршчыны з прычыны малалецтва яе караля.

Маці сына караля Маціяша была аўстрыйская прыгажуня Борбала Эдэльпек, якую ён выпадкова сустрэў у 1472 годзе на паляванні ў венскім лесе. Адно што... не была Борбала каралеўскай крыві...

А што азначаюць «Хуньядзі» і «Корвін»?

Ды адно і тое ж. Толькі Хуньядзі — гэта Воран па-вугорску, а Корвін — на лаціне! Воран з залатым кольцам у дзюбе — гэта родавы герб Маціяшаў.

Але я вельмі заглыбіўся ў гісторыю. Цяпер — пра мару лірычнага героя.

Балада мары

Дзівосным пер'ем грае цёплы птах, —
Ажно шчыміць і замірае сэрца
Ва ўзбуджана-шчаслівай паняверцы
Раскошу гэту бачыць блізка так.
І рукі ўзлятаюць да яе,
І пальцы чуюць трапятлівасць цела
Але,
зіхоткая,
амаль нясмела
Ірвецца птушка прэч
і растае...
Асірацела гойдаецца трон —
Вечназялёны куст, што цуд той гушкаў.
Была такой вясёлкаваю птушка —
Скуль на далоні чорнае пяро?

Ключавыя радкі «Балады мары»: «Дзівосным пер'ем грае цёплы птах», «Асірацела гойдаецца трон» і «Скуль на далоні чорнае пяро?». Вядома, што мара — гэта журавель. А сініца ў руцэ — гэта рэальнасць. «Балада мары» складаецца усяго з 15 радкоў. І хоць памерамі да твораў гэтага жанру не дацягвае, па змесце — гэта балада, і абысці яе ўвагай ніяк нельга, бо гэта адзін з ключавых твораў Ніны Мацяш.

«Дзівосным пер'ем грае цёплы птах». Як многа гэтым радком сказана! Тут і сініца, і... журавель. Тут тая птушка, якая ўжо была ў руках лірычнага героя, бо вядомая, адчутая яе цеплыня.

А яшчэ ў «Баладзе» згадваецца галоўнае слова, якое з'яўляецца марай для лірычнага героя. І гэтае слова «трон», які «асірацела гойдаецца». Янаш Корвін не можа яго заняць, бо ён незаконнанароджаны. А кароль Маціяш Корвін, які ўсё рабіў, каб Янаш заняў яго месца, «памёр у эпілептычным прыпадку» 16 верасня 1490 года...

Не, ён не памёр — яго, хутчэй за ўсё, атруціла жонка італійка Беатрыс Арагонская. Проста набліжаўся час, калі каралю трэба было пазбавіцца каралевы, якая не нарадзіла нашчадка кароны. А каралеве — караля, каб надалей заставацца каралевай...

Мяцеж Янаша Корвіна быў задушаны ў 1491 годзе.

Расчараванне — як абвал...

Паспрабуем прыдумаць надмагільны помнік Ніне Мацяш. Вядома — кніга і крыж. А яшчэ воран. Але воран на крыжы ў разуменні беларусаў быў бы вестуном бяды. Неяк так. Таму з'явілася стылізаваная птушачка. А яшчэ кольца. І «прыкаціўся пясцёнак да жаночай рукі». І проста неверагодна, што прыкаціўся партрэт-пясцёнак Ніны Мацяш з самой Італіі...

Калі разгадваецца вобраз лірычнага героя паэзіі Ніны Мацяш, то і вершы становяцца зразумелымі. Дык хто ж ён? Калі коратка, то, напэўна, той, хто быў каралём, хто мог заняць каралеўскі трон, хто знайшоў прытулак на чужыне, чый род захаваўся насуперак усім нягодам.

Сяргей Амяльчук



Фота www.pastavy.by

Проста людзі…



Мікола ІЛЬЮЧЫК

Дажыць да Спаса

Штогод, яшчэ задоўга да Спаса, вёску ахоплівае яблычны бум. Яблыкі толькі пачыналі налівацца, есці хіба што можна было нешта з ранняга — «Белы наліў» ці «Малінаўку», але ніхто не хацеў чакаць, калі яблыкі канчаткова даспеюць.

Яблыні трэслі, яблыкі збівалі кіямі, збіралі паданку на зямлі, насыпалі ў мяхі і везлі, хто на чым, у сярэдзіну вёскі да мясцовай крамы. Там стаяла вялізная машына. Мяхі збольшага ўзважвалі і высыпалі яблыкі ў агромністую жалезную скрыню грузавіка. Здзек з вясковых садоў паўтараецца колькі гадоў запар, столькі ж гадоў доўжыцца алкагольнае шчасце мясцовых выпівох…

З самай раніцы Мішка Дальнабой валок па цэнтральнай вуліцы гружаны мяхамі ровар. Адзін мех замацаваў на багажніку, другі ляжаў пасярэдзіне веласіпеднай рамы, а трэці — ажно на стырне. Мішка ледзьве трымаў ровар у руках, узмакрэў увесь ад натугі, але ягоныя вочы свяціліся неймаверным бляскам.

Мішка некалі сапраўды працаваў шафёрам на вялікіх машынах, шмат паездзіў па свеце. Але добрая праца і заможнае жыццё раптам скончыліся. Некалькі залётаў па п'янай справе выліліся ў вялікія непрыемнасці. Вытурылі Мішку з працы, ад чаго ён запіў ужо па-сур'ёзнаму. П'янкі, а пасля іх сямейныя сваркі, сталі звычайнай справай. У жонкі цярпенне скончылася хутчэй, чым насталі часы, пра якія ён увесь час казаў сваёй суджанай: «Усё! З панядзелка завяжу». Не ўдакладніў толькі, з якога панядзелка, бо тыдні міналі, праходзілі месяцы і нават гады, а ў ягоным жыцці нічога так і не змянілася. Жонка турнула Мішку і падала на аліменты.

Так апынуўся ён у бацькоўскім доме і стала сеў састарэлай матулі на шыю.

Мала таго, што карміла і апранала, час ад часу бегла старая на пошту, каб даслаць нейкія грошы ягоным дзецям. Каб толькі сыночка не пасадзілі і не прымусілі адрабляць прымусова тыя аліменты. Суседкам казала: «Што ж будзе, як мне жыць на свеце, калі дзіцёнка ў турму забяруць?»

Побач з машынай стаялі некалькі чалавек: Вадзік Эстонец, дзед Піліп і Шчаслівая Пара — Петрык з Ганначкай. Мішка Дальнабой прыпаркаваў свой ровар з каштоўным грузам, папросту падпёршы роварам задняе кола грузавіка. Крысом даўно не мытай кашулі абцёр узмакрэлы твар і замест прывітання прамовіў:

— А што, нарыхтоўшчыка няма?

— Міша, можа, з людзьмі вітацца трэба... — сказаў дзед Піліп голасам строгага настаўніка.

— Добрай раніцы, дзядуля, — Мішка правёў даланёй па той жа бруднай кашулі і працягнуў старому руку для вітання.

— Вось, зусім іншая справа, з гэтага трэба было пачынаць, а нарыхтоўшчык хутка прыйдзе, — задаволена адказаў на прывітанне дзед, — паспееш яшчэ за дзень дзвюма альбо нават трыма наваратамі пад плотам паляжаць.

Мішка ніяк не адрэагаваў на словы старога і стаў вітацца з іншымі.

— Здароў, Эстонец, а чаму толькі адзін мех натрос?

— Не твая справа, — незадаволена адказаў Вадзік.

— Добрай раніцы, добрыя людзі, — нарыхтоўшчык абвёў позіркам прысутных, зараз толькі дастану з кабіны паперы — і пачнём працаваць.

— Эстонец, кладзі свой мех на вагі, ты ж, напэўна, першы прыйшоў, — азваўся Дальнабой.

— Не, мы першыя прыйшлі, — у адзін голас вымавіла Шчаслівая Пара.

— О, як вы ўмееце, быццам усё жыццё хорам размаўлялі, — зарагатаў Мішка, — канечне ж, чаргі парушаць не будзем, парадак ёсць парадак, тым больш, што вам толькі мяхі парожнія і трэба, а ці будуць яны поўнымі — яшчэ не факт.

Шчаслівая Пара нягучна абмянялася паміж сабой некалькімі словамі, а потым Ганначка нясмела прамовіла: «Ой, людзі, дзеда Піліпа трэба прапусціць наперад, шанаваць трэба старых».

— Дзякуй табе, Аня, за турботы, але я так сабе стаю, я не па гэтых справах, вось купіў бохан хлеба, будзе нам з Бобікам дні на два. Дома сумна, самотна, а тут, як кажуць, у віры падзей…

Неўзабаве і Вадзік Эстонец упэўненым крокам рушыў да крамы, балазе тая зусім побач. Першая на гэты дзень доза ўжо, можна сказаць, у кішэні, а потым яшчэ нешта намалюецца.

— А што, ён сапраўды з Эстоніі? — нарыхтоўшчык паглядзеў услед Вадзіку.

— Ха-ха, ну які ён эстонец, з нашых, — адказаў дзед Піліп, — жыў некалі недзе ў Прыбалтыцы, там жонка засталася і дзеці. Калі спіўся канчаткова, то вытурылі яго з таго Еўразвязу. Цяпер не толькі віно, але яшчэ і кроў у бацькоў састарэлых п'е.

—А гэтыя, блажэнныя, ці як вы іх называлі?

— Шчаслівая Пара — Аня з Пятром? Таксама мясцовыя. Ён стары халасцяк, бабыль. Каму такі трэба, калі жлукціць амаль з дзяцінства, ды і яна недалёка ад яго адышла. Абое рабое. Аб'ядналіся ў адзінай любові да алкаголю, жывуць дзень да вечара, бацькоў ні ў аднаго, ні ў другога ўжо нямашака, браты і сёстры паз'язджалі. А яны то у адной хаціне валяюцца покатам, то ў другой. Нічога ім у жыцці не патрэбна, акрамя паўлітра, адзіная радасць у жыцці. Паводзяць сябе як юныя закаханыя, вось і сталі Шчаслівай Парай, курам на смех…

— Ну хопіць добрых людзей абгаворваць, — падаў голас Мішка Дальнабой, — і пра мяне, калі пайду, будзеш языком малоць, нейкі ты надта правільны, дзед Піліп!

— Буду, бо і ты, Міхась, усё ўтапіў у бутэльцы. Яна ж зусім невялікая, паўлітра ўсяго, але ў ёй прапала і сям'я твая, і праца, і ўсё астатняе.

— Не трындзі, дзед, калі захачу толькі, то ў любы момант кінуць магу, завяжу. Я ж не алкаш канчаны, як некаторыя. У мяне сіла волі! Калі хочаш ведаць, стары, я некалі цэлы тыдзень не піў.

— Ага, ведаю, як ты не піў, вавёрачку злавіў, і на тыдзень цябе зачынілі тады ў наркалагічным аддзяленні.

— Хопіць табе, стары, давай лепш пра што-небудзь прыемнае пагаворым, а то знайшоў жа ты тэму.

— Чаго ж не пагаманіць аб добрым з добрымі людзьмі, — лагодна адказаў дзед Піліп.

— А вось скажы ты мне, добры чалавек, — Мішка Дальнабой звярнуўся да нарыхтоўшчыка, — куды нашы яблычкі павязуць? Няўжо праўда, што на вінзавод? Гэта так разумець трэба, што яны неўзабаве вернуцца да нас у вёску. Але ўжо ў выглядзе бырла пладова-ягаднага?

— Э, хлопча, загнуў ты. Сокі ды дзіцячае пюрэ будзе з вашых яблычак. Нічога, што недаспелыя яшчэ. Там тэхнолагі папрацуюць з імі, і атрымаецца ўсё, што патрэбна, — смаката. А бырла зробяць вам са спірту самага таннага, развядуць вадой водаправоднай, дададуць туды рознай «хіміі»: араматызатары, узмацняльнікі смаку, фарбавальнікі ды яшчэ якой трасцы, і ўсё будзе выглядаць як натуральнае. Чытай тое, што дробнымі літарамі на этыкетцы напісана.

— О, ты чуў, Мішка, — уступіў у размову стары, — але ж не ўсё там узгадваецца на той этыкетцы.

— Ха-ха-ха, — зарагатаў Мішка Дальнабой, — хімік знайшоўся, Мендзялееў недароблены!

— Грэх са старога смяяцца, — строга прамовіў дзед Піліп, — дажыві яшчэ да маіх гадоў.

Нарыхтоўшчык зацікаўлена слухаў размову гэтых людзей, вясковых прадстаўнікоў двух розных пакаленняў.

— Дык што ж там яшчэ бырла змяшчае, а, дзед? — голас Мішкі стаў больш лагодным.

— Там шмат чаго. Напрыклад, ёсць «разбуральнік сям'і», «дэградантасобы», «мачанетрымальнік», «імпатэнтавітальнік», «алкаголезалежнік», «усягодобрагазаменнік»…

— Цьфу на цябе, так і думаў, што падкалоць хочаш, — Мішка вылаяўся і са злосцю паглядзеў вачыма-свярдзёлкамі ў выцвілыя зрэнкі старога, — клывай ужо дадому, правільны знайшоўся! Вучыць мяне ён… Я памятаю, як ты кляў мяне, смерці маёй хацеў.

— Не кляў я цябе, вы самі жыццё сваё губіце, наўмысна скарачаеце. Нішчыце і сябе, і тых, хто побач з вамі — не жывуць, а пакутуюць. Радуйцеся, што пакуль маткі вашы жывыя, кормяць вас, даглядаюць.

— А гэта ўжо не твая справа. Кормяць, даглядаюць… — Мішка наўмысна перадражніў старога Піліпа, — дрэнная тая маці, што сына да пенсіі не пракорміць! — Мішка зноў зарагатаў з удалага, як яму падалося, жарту.

— Сапраўды, пайду я ўжо, пара мне. Бобіка карміць трэба, а я языком мялю тут з вамі, час марную на размовы.

Дзед Піліп паклонам галавы развітаўся з нарыхтоўшчыкам і няспешнай старэчай хадою пайшоў сваёй звыклай дарогай. Мішка Дальнабой нарэшце вярнуўся да справы. Паклаў мяхі на вагі, потым высыпаў яблыкі ў кузаў.

— Э, браце, забудзь пра пенсію, што ты там старому пра пенсію казаў? Цяпер усё па-іншаму. Ты што, газет не чытаеш? Не бачыць вам пенсіі, як уласных вушэй. Ды і дажыць цяпер праблема, нават непітушчым, пенсійны ўзрост павысілі і яшчэ, кажуць, будуць павялічваць, — выказаўся нарыхтоўшчык.

Мішка нічога не адказаў. Хацеў ужо ісці ў краму, але нечакана ля машыны з'явіўся Вадзік Эстонец — з паўлітрай у кішэні старых нагавіц.

— Дальнабой, ты яшчэ ўсё тут чухаешся. Бяры «малую» ды даганяй, пасядзім разам, — прапанаваў ён Мішку.

— Дык я ўвогуле нікуды не спяшаюся, паспею…

***

На вялікай хуткасці, разразаючы святлом фар цемру ночы, пранёсся па вясковай вуліцы легкавік. З яго даносілася музыка, што заглушала нават роў рухавіка. Вярталася з нейкай гулянкі п'яная кампанія. Можа, таксама яблыкі здавалі. Пасля легкавушкі на абочыне дарогі застаўся ляжаць нікім пакуль не заўважаны пакурочаны ровар.

Шчаслівая Пара вярталася ў адзін са сваіх дамоў, каб адпачыць і пачаць раніцу таксама, як і сённяшнюю. Дзень будзе добры, бо сёння нагледзелі колькі неабтрэсаных яблынь у закінутых садках, а машына з яблыкамі будзе стаяць яшчэ колькі дзён, пакуль загрузіцца яблыкамі, што не дачакаліся Спасу. Як і трэба закаханым, крочылі яны, ўзяўшыся за рукі.

Вадзік Эстонец мірна спаў на старым ложку, які быў прадбачліва засланы матулінымі рукамі цыратай. Яму снілася Балтыйскае мора і сады, поўныя прыгожых і спелых яблык.

Па хаце тупала туды-сюды старая Настуля, што не змагла заснуць, бо не дачакалася сына.

— Прыйдзе, не раз такое было, — супакойвала сябе гаротная маці, — і гэтым разам прыйдзе, абавязкова прыйдзе, дачакаюся.

Аблізаны анёл

Цімафей Лук'янавіч Лысы толькі прачнуўся. Спяшацца не было куды, але і ўставаць з ложка не хацелася. Тут увогуле ніхто і нікуды не спяшаўся. У прытулку для знямоглых і састарэлых ніхто нікуды не бег. Адбегаліся.

Сягоння асаблівы дзень. Прыедуць новенькія. І, можа, Цімафею Лук'янавічу пашчасціць, і ў яго будзе сусед, а можа, і два. Будзе з кім перакінуцца словам. У яго пакоі пустуе два ложкі, акуратна засланыя, яшчэ з мінулай вясны чакаюць новых гаспадароў.

Цімафей Лук'янавіч ведае ўсе асаблівасці гэтай установы. Шосты год, як-ніяк, жыве тут. Толькі позна ўвосень тут шматлюдна. Бо з вёсак прывозяць усю старэчу, што паціху дажывае свой век. Улады баяцца, каб не пагарэлі за зіму са сваімі абшарпанымі печамі і трэснутымі комінамі. Вось і вязуць сюды ўсіх, каго змогуць угаварыць.

А гэта не так проста. Большая частка пенсіі застаецца дзяржаве на іх утрыманне, а дзецям гэта ой як не падабаецца. Самім даглядаць старых бацькоў не надта хочацца, але ж, бываючы ў іх рэдкімі наездамі, ад грошай ніхто не адмаўляецца. Колькі іх трэба тым старым? Вопратку носяць тую, што засталася з мінулых гадоў, а на ежу трацяць зусім мала, бо кожны, пакуль ёсць сілы варушыцца, стараецца і бульбачку вырасціць і, як кажуць, да бульбачкі.

Цімафей Лук'янавіч мог бы доўга разважаць над гэтай тэмай, але хутка сняданак, і будзе сорамна перад персаналам, калі прыйдзе ў сталоўку нягалены.

Не, гэта не па ягоных правілах. У гэтым плане нічога не змянілася ў яго жыцці.

Тут ён бескампрамісны: галенне раніцой праз дзень. Нават адэкалон яму купляла загадчыца, пэўна ж, за ягоныя грошы. Няхай сабе і не самы лепшы.

Стары паглядзеў на сябе ў люстэрка, што вісела на сцяне побач з ракавінай.

Густая шавялюра сівых валасоў нервова ўздыбілася за ноч. Іх таксама трэба змачыць вадой і ўтаймаваць іхнюю непаслухмянасць расчоскай. Гэта таксама адна з ранішніх працэдур, што стала звычкай.

— Вось табе і лысы, — прамовіў, як і ўчора, як і кожны мінулы дзень, быццам насміхаючыся з уласнага прозвішча, што ніяк не адпавядала рэчаіснасці.

Цімафей Лук'янавіч выканаў усе гігіенічныя працэдуры. Напаследак пырснуў з бутэлечкі на далонь, задаволена паляпаў па шчоках і пайшоў у сталоўку.

Павітаўшыся з прысутнымі, ён узяў паднос са сняданкам і сеў на сваё ўлюбёнае месца ля акна. У сталоўцы было шмат пустых месцаў: у прытулку было нямала знямоглых. Іх кармілі ў пакоях, дзе тыя жылі. На адмысловым вазку санітаркі вазілі ім ежу, а калі хто не здужаў есці самастойна, кармілі іх, быццам маленькіх дзяцей.

Наконт назвы памяшканняў, дзе жылі старыя, адзінага меркавання ніколі не было. Нехта называў іх адпаведна нумарацыі боксамі, хтосьці палатамі. Але Цімафею Лук'янавічу бліжэй было слова пакой. Так неяк больш душэўна, па-хатняму, чым казённае «бокс» альбо бальнічнае «палата».

Вяртаючыся са сталоўкі ў свой пакой, у калідоры Цімафей Лук'янавіч сустрэўся з загадчыцай.

— Прывітанне, Вера Сяргееўна, — ён элегантна нахіліў галаву і ўзняў руку, быццам спрабуючы прыўзняць нябачны капялюш.

— Вітаю, Цімафей Лук'янавіч! Вы, як заўжды, элегантны і сапраўдны прыгажун.

— Вера Сяргееўна, сёння ж новенькія прыедуць, а ці мне сусед будзе?

— Будзе, Цімафей Лук'янавіч, а калі пашанцуе, то, можа, і два.

— Вось і добра, а то здзічэю зусім тут у вас. Пагаманіць няма з кім, хіба што з радыёпрыёмнікам.

— А вы не сядзіце ў боксе са сваімі кнігамі, пахадзіце. Вы ж яшчэ вунь які зухаваты кавалер. Спусціцеся на другі паверх да дзяўчат. А то ім самотна.

— Эх, Вера Сяргееўна, каб тым дзяўчатам хто гадкоў пяцьдзясят адрэзаў, то была б размова.

— Цімафей Лук'янавіч гучна засмяяўся, на што загадчыца таксама адрэагавала звонкім рогатам...

Цімафей Лук'янавіч узяў са стала кніжку, у якой прыкладна на палове замест закладкі ляжаў фотаздымак. З яго ўсміхаўся прыгожы малады чалавек у форме лётчыка грамадзянскай авіяцыі. Хтосьці мог падумаць, што гэта фота самога Цімафея Лук'янавіча з часоў маладосці. Але не, гэта быў сын. Ягоны Вадзік. Як жа даўно яны не бачыліся! Як яны з жонкай любілі яго! Ён любіць яго і цяпер. Гэта ж адзіны сын. «Анёлак наш», — любіла казаць Марыя. А ён і сапраўды лётае ў небе на вялізных і прыгожых лайнерах. У яго іншае жыццё, жыццё без хвароб і адзіноты. «Няхай будзе яму добра, барані яго, Божа», — нячутная штодзённая малітва з бацькавага сэрца паляцела ў неба.

Прастаяўшы ля стала ў нейкім асабліным настальгічным роздуме, Цімафей Лук'янавіч так і не наважыўся чытаць пачатую кнігу. Узгадаліся нейкія эпізоды з мінулага жыцця, з часоў маладосці, з тых шчаслівых дзён і гадоў, калі ўсе яны былі разам: Марыя, Вадзік і ён...

Цімафей Лук'янавіч падышоў да акна. Зіма паціху ўступала ў свае законныя правы. На газонах і счарнелай клумбе шэрань. Дрэўцы зусім голыя, ім холадна і адзінока, бо нават птушкі недзе падзеліся і не хочуць сядзець на аголеным голлі.

У двор прытулку заехала машына — бела-чырвоны фургон хуткай дапамогі. Цімафей Лук'янавіч, як ніхто іншы, ведаў, што ў гэтай установе ніхто і нікуды не спяшаецца, і нават надпіс на бачыне аўто «Хуткая дапамога» выглядае недарэчна. Звычайны аўтамабіль з гаража раённай бальніцы. Можа, лекі нейкія прывезлі, ці, можа, бялізну з пральні, а можа, дактары на чарговы, для галачкі, медагляд прыехалі. Што тут аглядаць? Косці старэчыя ці збрыжавелую скуру.

Бывае, што і чыноўнік нейкі завітае, асабліва перад выбарамі, каб зрабіць справаздачу пра клопат дзяржавы пра старых і сацыяльную абарону хворых, самотных і знямоглых. Але тыя едуць на вялікіх чорных машынах — у доўгіх седанах, хоць едзе адзін, толькі з кіроўцам, ці ў высокіх пазашляхавіках, хаця едзе ўвесь час па асфальтаванай дарозе.

Цімафей Лук'янавіч тупаў па пакоі і перыядычна пазіраў, каб ведаць, што там робіцца на двары. Ён знаў са свайго ўласнага досведу, што дзесьці паміж сняданкам і абедам павінен прыехаць аўтобус з новенькімі. Вера Сяргееўна не магла яго падмануць. Сёння ў яго абавязкова будзе сусед, а можа, і два. Няхай сабе і два, але калі нават адзін, то гэта таксама вельмі добра. Хоць нейкая разнастайнасць у ягоным жыцці, у якім кожны новы дзень падобны на папярэдні.

Хто ведае, можа, нехта і са знаёмых трапіцца. Цімафей Лук'янавіч доўгі час працаваў на розных высокіх пасадах, шмат ездзіў па раёне і ведаў многіх.

Ён пстрыкнуў пімпачкай на панэлі радыёпрыёмніка. Палілася нейкая рытмічная музыка. Пакруціў кола настройкі. Наступная радыёстанцыя аж залягалася ад смеху з нейкага глупства, сказанага ў прамым эфіры.

Крутнуў зноў. Кіраўнік дзяржавы бэсціў мясцовых карупцыянераў і замежных ворагаў. Крутнуў яшчэ. З дынаміка палілася прыемная мелодыя. Але Цімафей Лук'янавіч не мог уцяміць — Бах гэта ці хто? Прабачыць сабе такога ён не змог, тузануў шнур і выключыў прыймач.

Зразумеў — гэта нервовае, і зноў стаў тупаць па пакоі, раз-пораз паглядваў у акно.

Раптам у двары нешта па-добраму, прывітальна прасігналіла машына. Цімафей Лук'янавіч паглядзеў скрозь шыбу. Там стаяў невялікі аўтобус. І гэта былі сапраўды яны — новыя, няхай сабе і часовыя жыхары ўстановы, якая для яго стала сапраўдным домам, бо ягоны ўласны дом, дом ягонай сям'і належаў цяпер іншым людзям.

Казырок над уваходам у будынак перашкаджаў разгледзець усё, што там адбывалася і колькі дакладна людзей прыехала на засяленне. Але ж сэрца ўсхвалявана і радасна затрымцела ў грудзях. Цімафей Лук'янавіч дакладна ведаў: у яго будзе сусед па пакоі, і зіма, што хутка набліжалася, не будзе для яго такой сумнай і доўгай.

Цімафей Лук'янавіч падумаў, што для афармлення новенькіх патрэбен нейкі час, але вырашыў сёння нікуды не ісці са свайго пакоя, каб самому сустрэцца з новымі жыхарамі. Праз сілу, але прымусіў сябе ўзяць у рукі кнігу. За кнігай і не заўважыў, як прайшоў час. Неўзабаве ў дзверы пастукалі. Першай увайшла Вера Сяргееўна, за ёю, крыху нерашуча, у пакой увайшлі двое мужчын.

— Ну вось, Цімафей Лук'янавіч, дачакаліся, нарэшце, — у голасе загадчыцы адчувалася радасць.

— Добры дзень, — прамовілі новенькія.

— Вітаю і вас, — Цімафей Лук'янавіч працягнуў кожнаму руку.

— Іван Яўхімавіч, — лаканічна назваў сябе першы.

— Юзік, проста Юзік, — бадзёра вымавіў другі.

— Вось і пазнаёміліся, займайце плацкарты, — Цімафей Лук'янавіч паказаў на вольныя ложкі.

— Уладкоўвайцеся, тут вам будзе добра, а я пабегла — справы. Не буду вам замінаць, — скорагаворкай выпаліла загадчыца, а праз імгненне пра яе нагадваў толькі цокат абцасаў у калідоры.

Новенькія нерашуча наблізіліся да ложкаў і пачалі распакоўваць свой скарб і раскладваць яго на паліцах тумбачак. Цімафей Лук'янавіч не наважваўся першы пачаць размову і чытаў, зрэдку адводзячы позірк ад кнігі. Новенькія сціпла, амаль шэптам, размаўлялі аб нечым паміж сабой, стараючыся не турбаваць Цімафея Лук'янавіча. Атмасфера насцярожанасці і лёгкага недаверу захоўвалася, і толькі пасля таго, як мужчыны разам схадзілі на вячэру, яны пачалі гаварыць так, быццам ведалі адзін аднаго доўгі час.

Цімафей Лук'янавіч ні з кім з іх ніколі раней не сустракаўся. Іван Яўхімавіч — настаўнік-пенсіянер з аддаленай вёскі. А Юзік, таксама вясковец, з ліку перасяленцаў. Уся іх вёска закапаная ў зямлю разам з пабудовамі, садамі і агародамі. А насельніцтва рассялілі ў чыстую зону. Вось пакуль і ўсе звесткі, якія сталі вядомыя Цімафею Лук'янавічу за гэты кароткі тэрмін знаёмства.

Пра сябе ён шмат чаго распавёў. Хоць асабліва і не было чаго расказваць, хіба пра сына, пра сваё ўдаўства і што прытулак стаў для яго сапраўдным домам. Што ўласны дом давялося прадаць, бо ў сына былі цяжкасці, трэба было набываць добрую кватэру, знайшліся людзі, што былі гатовыя заплаціць добрыя грошы, і ён пагадзіўся. Ведаў, што Марыя была б таксама не супраць такога рашэння, бо яны любілі Вадзіка і былі гатовыя для яго на ўсё. Сын абяцаў, што купіць бацьку аднапакаёўку ў горадзе альбо дамок у прыватным сектары. Але ў выніку — ні дамка, ні кватэры, а ён у прытулку дажывае свой век.

Можа, і зашмат чаго ён расказаў гэтым зусім малазнаёмым людзям. Але ж што тут такога? У гэтай установе амаль у кожнага нешта падобнае. Цімафей Лук'янавіч нават фота паказаў свайго сыночка — Вадзіка-анёлка, які недзе лётае па сваіх нябесных маршрутах.

Вечар у прытулку настаў імгненна. Лёгкі змрок насунуўся на зямлю, а ў пакоях пачалі запальваца лямпачкі. Але хутка яны пачалі тухнуць. Не любяць тут яркага святла. А яшчэ старыя, быццам дома, эканомяць і вядуць свае ціхія размовы ў прыцемку. Канечне ж, тады, калі ёсць з кім размаўляць.

— Іван Яўхімавіч, а што вы выкладалі ў школе? — запытаўся Цімафей Лук'янавіч.

— Прасцей будзе сказаць, што я не выкладаў, — весела адказаў той, — выкладаў усё, нават пабыў завучам і нейкі час у дырэктарскім фатэлі пасядзеў.

— А вы, Юзік, кім працавалі, — Цімафей Лук'янавіч звярнуўся да другога суседа, — чым займаліся?

— Я? Я з простых. Да перасялення на трактары працаваў, а пасля Чарнобыля на новым месцы ў калгаснай брыгадзе рознымі справамі займаўся, а потым ужо і пенсію далі.

Мужчыны ціха размаўлялі паміж сабой, распавядалі нейкія падрабязнасці са свайго жыцця. Нават тое, пра што не гаварылі ніколі і нікому. Тут можна, тут усе ў аднолькавым становішчы. Тут ніхто не абгаворыць і не насмяецца. Тут у кожнага свой боль, свая крыўда і ўласнае асэнсаванне жыцця, якое амаль прайшло.

— Мабыць, я адсюль ужо і не паеду, — прамовіў Іван Яўхімавіч, — тут добра, ніхто мяне не будзе папракаць кавалкам хлеба.

— А што ў вас здарылася? — Цімафей Лук'янавіч яшчэ падумаў, ці не пакрыўдзіў малазнаёмага чалавека такім пытаннем.

— Як вы тут апынуліся? Прабачце, калі пакрыўдзіў вас, можаце нават не адказваць.

— Чаму ж не адказваць, што было, тое было.

Ён крыху памаўчаў і пасля кароткай паўзы загаварыў. Пачаў амаль з юнацтва. Пра вучобу, працу ў школе, сям'ю. Пра тое, што рана аўдавеў, што дзеці з'ехалі за мяжу яшчэ пасля распаду Саюза. З-за акіяна не так проста і прыехаць. Ды і свае праблемы, што ў сына, што ў дачкі. Даглядаць састарэлага пагадзіўся пляменнік, які быў таму бліжэй за сына. Ён рана застаўся сіратою, і Іван Яўхімавіч клапаціўся пра яго, як пра ўласнае дзіця. Вывучыў, ніколі не шкадаваў грошай. Але цяпер у таго падраслі дзеці, і жыллёвая плошча была не лішняй. Таму і ўгаварылі перапісаць жытло на пляменнікавага сына з умовай, што будуць даглядаць старога да скону. Толькі нейкі тыдзень прайшло пасля афармлення папер, як Іван Яўхімавіч зразумеў, што новыя гаспадары не рады ягонай прысутнасці. Пачаліся абра́зы, крыўды і папрокі...

Ён рабіў кароткія паўзы ў размове. І калі б у пакоі гарэла больш яркае святло, можна было заўважыць слёзы на ягоных вачах. То, можа, і добра, што свяціла толькі настольная лямпа і старэчых слёз не было відаць. Мужчыны, нават у такім узросце, не павінны плакаць, нават калі гэта слёзы крыўды ад пакут за дабро.

Іван Яўхімавіч сядзеў на ложку, глядзеў у сцяну, а потым нібыта падсумаваў:

— Таму я тут і, мабыць, застануся тут ужо назаўсёды...

Усе прыціхлі. Кожны думаў пра сваё. Раптам закашляўся Юзік і, нібыта нават выбачлівым тонам, сказаў:

— Я што хачу вам сказаць, паважаныя... Чалавек я просты і прабуду тут з вамі толькі да вясны. Бо ў вёсцы ў мяне і хата, і сад з агародам. З гаспадаркі, праўда, толькі куры засталіся, суседка пракорміць, зерня хапае. Не магу я без зямліцы. Ды і царква мая там, у вёсцы. Не перайначу я ўжо сябе. Але, дальбог, скажу вам... вы людзі адукаваныя, разумныя, але ж нешта не тое рабілі ў сваім жыцці. Я б і не паехаў сюды, але дачка кажа: «Тата, зімуй у прытулку. Бо я так дагледзець цябе не змагу». А тут цёпла і сытна. Чаму б і не зімаваць, як птушка ў выраі. А потым да сваіх берагоў, а як жа інакш?

Яму ніхто не пярэчыў. Тут умеюць слухаць адзін аднаго. Інакш нельга. І нават калі ты не скажаш нешта сёння, то ў цябе будзе магчымасць расказаць гэта заўтра ці ў нейкі іншы доўгі вечар.

Пасля кароткага перадыху Юзік адгаварыў-адспавядаў:

— Што ж вы, хлопцы, усё жыццё дагаджалі людзям? Адзін свайму сыну-анёлку, другі чужога аблізваў усё жыццё. Але ж гэта людзі, яны такія. Ты яго ўсё жыццё аблізваеш, а калі адзін раз не абліжаш, не дагодзіш, то крыўдзе на цябе, ставіцца варожа. Хіба не так? Хіба з вамі не так было?

Ён задаваў пытанні, але не чакаў на іх адказу, а таму працягваў:

— Вось і век вам свой дажываць не з тымі, каго ўсё жыццё любілі і каму нічога не шкадавалі, а тут, няхай сабе і ў добрым, але чужым казённым доме. Таму што дагаджаць трэба было не людзям, у першую чаргу, бо яны ж проста людзі, а таму, хто там...

Юзік узняў руку і паказаў пальцам уверх, у неба. Ён больш нічога не гаварыў, але пальца не апускаў.

Цімафей Лук'янавіч з Іванам Яўхімавічам узнялі вочы, але там была толькі столь.

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 9 (145) | 28 верасня 2018 | № 35 (598) Новы час

Радкі любові



Данута БІЧЭЛЬ

У Курапатах

Выбіраеш свой шлях? Выбірай!
З апраметнай не трапіш у рай!
З Курапатаў шлях — на той свет,
а цяпер там спраўляюць банкет.

Скачуць чэрці ў гасцях на касцях
нявінна забітых людзей…

…Жывыя за рукі трымаюць дзяцей…
Дзеці трымаюць сцяг.
Немаўляты, таму што анёлы…
тармозяць чортавы колы!

У чарцей шмат іншых хадоў —
іх машыны заводзяцца зноў…
Нібы град, арда чарцянят
на крывавых касцях Курапат.

…Беларусь у яме маўчыць…
Вам смачна жэрці і піць, —
хто святую памяць Яе
за юдаў мядзяк прадае?

…Мара, Давід і Франак,
Ян, Якуб і Сымон…
у жывым ланцугу перад ямай:
— Вымятайцеся, чэрці, вон!

На магілах не сеюць пшаніцы!?
Курапаты — дарога ў нябыт.
Крыж Хрыста на нявінна забітых
з татам уздымае Давід.

Хто скрыўдзіў мяне адну —
таго стараной абміну…

Хто зняважыў наш род і сцяг —
таму люцыфер суддзя!
За здзек над касцямі без трун —
няхай пакарае пярун!

Радкі любові

Пад збаўленчую музыку цішы
прачынаюся на гарышчы,
праз шчылінку месячык з неба
цалуе вуснамі таты.
Праз стрэху ляцець страшнавата…
Усё само адбудзецца неяк…

Абы Ты, мая Ластаўка ў стрэсе,
маё сунічнае ўзлессе,
Галубка мая, Свіцязянка,
аднаўлялася з ранку да ранку.

Каб Дняпра і Нёмана хвалі
з любоўю цябе цалавалі,
чыстыя хмаркі і росы
сукруху з сэрца змывалі.

Радзіма, на мапе нябёсаў
адбітак Божай далонькі.
Цень ад далонькі Божай
на мапе зямелькі босай…

Заполле

Светлай памяці Алеся Зайкі

Я думала: наша Заполле
ад Ліды да Косава,
тамканюшыну косяць
літоўкамі-косамі,
каб не параніць пчолак…
А сябра Алесь Зайка
заблукаўся паміж вясёлак…

Прачынаецца ў паднябессі,
на крылцах школьных анёлаў,
у горы палескай сям'і,
у смутку духоўнай радні…

У памяці тэлефона
шчэ захаваўся Ваш голас…
Вы адгукаліся зрэдку…
Таму і прашу:
— Пазвані!

Пазваніце мне з таго свету,
сябра Алесь Зайка!
Як там на Божай градцы
зернем сябе пасеялі?
Няўжо і там мы заціснуты
між Польшчаю і Расеяй?
— Яны думаюць, што мы ўгнаенне,
але мы тут насенне!

Пакуль не памерлі словы
ў агародах вясковых,
пакуль жыву, буду памятаць
Ваш голас, бадзёры самы:
— Калі ёсць рай на небе,
то насельнікі яго — нашы мамы.

Як збіралі Вы тут,
як выцягвалі з багны на груд,
абціраючы бруд,
моўны скарб, гэты цуд,
што бабулі пакінулі нам,–
так збірайце і там
непамерлыя словы,
і замест тэлеграм,
там, пры Богу, прыдумайце спосаб,
як вярнуць нашу мову адтуль.

Натхненне

З рэўнасці, па маладосці,
нехта некаму пазайздросціў…
Злосная, як запалак,
распаліла пажар ад сварак.

Вось такое здарэнне…

На прымірэнне
яна пасылае яго
на бязлюдную выспу…
Ён павінен сваё натхненне
на выспе на досвітку высыпаць…
І каб аніхто не ўбачыў…

А Паэт усё перайначыў!
Захацеў так жыць, каб натхненне
не з'ўлялася на імгненне,
а пасялілася ў сэрцы
ад нараджэння да смерці,
і без перасялення
заняло ўсяго сэрца абшар…
І няхай там палае пажар!

Так навучыцца трываць,
усё па-свойму мяняць,
і кожнае імгненне мяняцца,
ёй, адзінай, жыццё аддаць,
нікому больш не здавацца.

Як з Гародні суполкай Максіма да Айца Уладзіслава Чарняўскага ў Вішнева ў пілігрымку хадзілі

Ніхто не зрабіў здымка,
як адбывалася пілігрымка…
Непапраўная страта…
Паэтам Максімам сабрана брыгада.
А я служыла як папялушка
ў Максіма на пабягушках…

Да Іўя, пасля да Юрацішак
ехалі, надзеі не страціўшы.
А далей — маршрут да Смаргоні…
А да Вішнева шлях праз Валожын.
Каб жа мелі мы свой самалёцік прыгожы
або панскую брычку ды коней!

Пешкі рушылі ў Вішнева.
З намі — жабкі, польныя конікі…
шпакі ды ўсе лішнія.

А неяк ужо так выйшла,
што ў Беларусі лішнія
ўсе — хто тут нарадзіўся…
А Краінай кіруюць іншыя,
хто ад краю чужога прыбіўся…

Акром мяне, наіўноты зухвалай,
Пацюпа ў Менску збірае славу…
— А ты памятаеш, Юрась,
як пілі мы ў Юрацішках хлебны квас?
— Памятаю, як елі піражкі з салам!
— Не-а! Гэта было ў іншы раз…

— Хто ішоў з намі ў Вішнева,
нібы на той свет?
— Зміцер Кісель, Васіль Бязмен
і Едрусь Мазько, вучоны-паэт.

— І я, якая «плохо себя вела»,
на хворых нагах, як начная імгла.
І ты, Пацюпа, з юнацкай адвагай,
падвязаўшы джынсы чырвонай дзягай.

— А яшчэ памятаю Дзяўчыну…
— Алу, Алену, Ніну, Аліну?
— Дзяўчына імя свайго не называла,
каб нас падбадзёрваць, «Гадзінкі» спявала…

Дзяўчына сонца на промні вяла,
а вакол сонейка хмарка плыла,
дзе Яна ішла, свяціўся гушчар…
напаўняліся душы дзіўным святлом,
нібы агнём паветраны шар,
і нібы коцік, мурлыкаў гром.

Пайшлі мы ў галодную пілігрымку —
чорнага хлеба сухую скарынку
ніхто не меў у кішэні ні крошкі…
— А яшчэ памятаю, на плоце ў Юрацішках
висела аб'ява — прадаюцца цімошкі!?

Ні крамы, ні студзенькі, ні крынічкі,
ні жывой душачкі, ні жывічкі.
Ні цягніка, ні дыван-самалёта,
ні казачных гуселькаў, ні скараходаў…

Ні коніка ў яблыкі, ні закінутай хаты…
Толькі вецер крылаты,
хмарак лёгкія стрэшкі,
на сонейку спечаныя галавешкі…

Свята святла паміж жніўнем і вераснем,
жыта пажалі, буракі не капалі.
На вялікіх балотах буслы збіраліся,
а людзі, накрыўшыся скурамі, спалі.

Вуркала навокала, скрыпела,
стракатала, цёхкала, млела,
клекатала нашымі продкамі,
якія збіраліся ў вырай,
плюскалася, сагрэтая, на поплаве,
нас незаўважна паіла
дабрынёй, любоўю і сілай.

Не доўга цягнулася пілігрымка,
таму што мы ішлі, як у снах, —
убачым наперадзе вешку, і, ах! —
пераскокваем цэлы абсяг,
а сонейка нас чакае ў кустах,
а недзе, збоку, іграе катрынка…

А чаму навокал было так пекна,
і ніхто ў балоце не ўграз?
Бо Максім зачыніў перад намі пекла,
Дзяўчына з балота вывела нас!

Калі на абочыне ў пыле
ногі мяне падкасілі,
выйшаў з лесу вясёлы трактар,
падвёз да сядзібы святарскай…

А як мы ў мястэчка ўязджалі,
людзі так дзіўна казалі:
— Вучні вяртаюцца ў Ерузалем!
А дзе ж на вcovліку Пан Гаспадар?
Хрыстос адвергнутых, нас, навяртаў!

Дзень гэты — так пісаў Катул…
Дзень асенні даўгі…
Расцягнуліся мы па дарозе, але дайшлі
да беларускага святара.
Каб зняць праўіны ўсяго жыцця
на святарскім гародзе працай,
хлопцы ў садзе пачалі завіхацца —
зграбалі ў кучы, палілі бульбоўнік…
З любячым нас Айцом
размаўлялі з любоўю.

А ў памяшканні
цуды чыніла маўклівая Пані —
прайшлася па ўсіх закутках,
пыл змахнула блакітнай хусткай…
У Дзяўчыны выходзіла ўсё наляту:

чыгункі перамыла, запаліла пліту,
замясіла цеста, напякла бліноў…
Насмажыла рыбы, зварыла куццю…
А мне захацелася спаць, як дзіцю…
Прачнулася, нібы нарадзілася зноў.

З лісцем у садзе спалілі грахі.
Вячэралі сціпла ў святой сям'і…
Як добра ўрэшце знайсці свой дом
за адным сталом са святаром,
які роднай мовы не зрокся — адзін…
спавядаў па-роднаму і хрысціў.

Айцец Чарняўскі, просты, вясковы,
ён распаліў нашы сэрцы, як дровы.

Добры Божа пасля таемнай вячэры…
нашым хлопцам таемныя справы даверыў…
Зміцер, Васіль і Едрусь-паэт
пайшлі ў пілігрымку ў таемны засвет…

Зміцер Кісель забіты ў сваёй кватэрцы.
Едрусю Мазько на вуліцы спынілася сэрца.
Васіля Бязмена звёў у магілу рак…
Проста, будзённа, сціпана так…

Бог вызначае людзям іх час…
О, Прачыстая Дзева, памаліся за нас!

Экспромт пасля кароткага сну

Ва ўсіх вялікіх хаты спалілі.
Залічаю сама сябе да вялікіх…

Мама, тата, вы ў маім сне,
падобныя да спарыша…
Спынены час глыбока на дне,
і вечная з пяткаў душа…

Прыходзіце сном
з няспаленай хаты,
знікаеце зноў
за свае небагляды…
і анігадкі…
Болей наш кроцік не поле
вольныя градкі.

Высахлі ў лесе суніцы…
Мама, тата,
не ўздумайце мне не сніцца…
Не шкадуйце вы мае вочы,
няхай плачуць…
Не шкадуйце вы маё сэрца,
няхай б'ецца!

Галіне Скарыне, сяброўцы Ніны Мацяш

Белым кветам адзета каліна…
У Белым возеры белы глей.
Унучка Францішка Скарыны Галіна
з продкам святкуе свой юбілей.

У Белым моры ёсць цёмнае месца,
там гадуецца зграя гадзюк.
Гады, чуеце добрае сэрца
і пяшчоту Галініных рук?!

Нават смутак з'ўляцца рэдка
паміж светлых хвілін пачуцця.
На руках у Галіны — паэтка,
усё жыццё, як малое дзіця.

Адбаліцеся слоўцы Ніныны…
Хвалі, воблакі, белы птах…
А нашчадкі Францішка Скарыны
прадаўжаюць Скарынаў шлях!

Святлане Воронік да Дня нараджэння

Мілая Света!
Прымі ад мяне ў падарунак —
спякотнае лета:
нават цыбулька, асенняя кветка, —
зацвіла, што ў чэрвені рэдка…

Ад калючых асокаў і сарокаў букеты —
на дзень нараджэння складаю для Светы!

Магчыма, Света,
буду дарыць табе кожнае лета —
і паспею стварыць вянок запаветаў.
А, можа (о, Божа!), адзін гэты верш,
і ты яго на кускі не парвеш,
бо ён не з газеты, а з інтэрнэту,
і няхай так ляціць у бязмеж…



Фота www.fotokto.ru

Але ты, якая без працы,
усё ж змагла здагадацца,
што мая стамлёна сівая галоўка
памятае не так, як у траўні салоўка,
а рыфмуе замглёна,
нібы паважная пані Варона,
якая зляцела з гняздзечка ў траву
ды каменем аб галаву…

Я табе пасылаю містычна
сваю малую варонку
і гэту Краіну-замглёнку,
і ўсю тутэйшую завядзёнку:
зрыфмаваць такі просты верш.

Каб пасляць табе мора шчасця —
гэта было б найлепш!
Але дзе ж узяць яго? Дзе ж?

Пра цемру

Ноч зацягнулася.
Дровы ў печы згарэлі, попел датлеў.
Выпілі, з'елі — хто запас які меў.

Усё, што любілі, граць заказалі музыку…
«Вітай, Марыя!» — хорам малітву
паўтаралі без ліку.

— У цемры з дарогі не збіцца —
вось што было б найлепш!
Нехта, каб не сварыцца,
прыдумаў конкурс на верш.

Сярод сабраных паэт быў адзін Сляпы.
Яго не палохалі вушакі, тарапы.
Нічога ён, як аслеп, не ствараў.
Дзедаву хату крокамі мераў, шпацыраваў
туды-сюды, набіваў гузакі на лоб…
Рукамі навобмацак бачыў, патыліцу скроб.

Сляпы беспрасветнай ноччу сярод сляпых!
Навошта вершы Сляпому,
калі ён не чытае кніг?
Але перастаў наракаць на цемру натоўп…
Пачалі падслухоўваць,
што ў цемры Сляпы сабе чоўп.

«Там ад шырокіх веялак
сыплюцца на гладкі ток
бомбы чорнага бобу,
зялёны шрапнель-гарох»…

Сусед суседу на вуха кажа:
«Уважліва слухай цяпер…
Сляпы — плагіят і злодзей,
верш напісаў Гамер!»

«Калі слабее каханне,
тады прачынаецца страх:
а што пра нас скажуць людзі…
бусліных крылаў узмах!»

Той самы да таго самага шэптам:
«Пабойся Бога!
Ён гэта скраў у Борхеса…
— Не-а, у Джона Гага»

Нарэшце ў цямрэчу з ніш
святло прабілася звыш…
Абвясцілі вынікі конкурсу…
Сляпы здаў на конкурс верш,
які так пачынаўся:
— Калі я ўвайшоў у стан прасвятлення,
як быў у цемры, так у цемры застаўся…

…Калі Краіну і неба над ёй
перамешваюць з бруднай зямлёй,
ператвараючы ў склеп…
Каб знутры растапіць
пыхі ўсяленскай зло,
каб у сэрцах бяздушных людзей
распаліць цяпло,
трэба, каб нехта аслеп…

Ці можа адзін Сляпы
абудзіць бяздушных людзей,
растапіць іх сэрцы знутры,
паўплываць на ход падзей?

Сэрца асляпляе ныя:
эпідэмія шызафрэніі
цывілізацыю нішчыць,
хто ўмее, той грошы лічыць.

Духоўная слепата,
старэчы маразм маладых,
дэпрэсія, смутак, адчай —
збіваюць пад дых.

…Тут не канчаецца беспрасветная ноч.
Чорны попел знішчае
зялёныя зрэнкі воч.
Чорная злосць топча
сагрэты сонейкам след.
Паэт аслеп.

Чорны пясок касаватая хрумстае на зубах.
Прападае каханне, з ім прападае страх.
Дух Святы пакідае, а, здрадаваная, ты
трымаешся, нібы слімак, за чужыя платы.

Жыццё адпачыць не можа,
каб завесціся зноў,
як пачынаецца песня ад вясковых асноў,
як ад малітвы абуджаецца ў пятках душа,
як, загнаная ўсімі, да іхняй злосці дайшла…

Дзе той Святар — удзяліць Збаўленчай Крыві Укрыжаванага і Ўваскрослага Збаўцы Хрыста,
грэх адпусціўшы, ціха сказаць: —Ажыві!?

…Там, дзе аднойчы я нарадзілася зноў,
кожная расінка свяцілася, было шмат сяброў…
Цяпер там не засталося нічога, апроч начы…
І як мне аднойчы ўдалося адтуль уцячы?
І як мне па цемры душою назад вярнуцца,
каб з душамі мамы і таты не размінуцца?

Алег Лойка

Прафесар юнацкіх душаў!
Калі гора прымусіла ампутаваць нагу,
ніхто з яго вучняў не адгукнуўся
забытым словам:
— Дапамагу!

Паслухалі, выйшлі — жывуць, як чужыя…
Душы да ўлады чужой перашылі…
А ён, стваральнік самабытнай
культуры, —
ад чэрствай, непрамакальнай скульптуры,
ад тых, каму розум і сэрца аддаў, —
у Слонім, як сам ад сябе, уцякаў…

Уцякаць гэтак страшна…
А, можа, не страшна?
да Бога, вечнага, ад сябе, учарашняга…
хто мог залічыць у студэнты кожнага,
таленавітага, пустапарожняга,
кожнаму ўкласці ведаў, як лёду…
мудрасці кніжнай, Лойкавай логікі.

Калі патрэбны рукі і сродкі,
чым заняты былі сябры-аднагодкі?
Ніхто на руках яго не паднёс,
як падносіў бязногіх Хрыстос…

Ён вучыў лётаць адкрыта і ўпотай…
ды ніхто, між будзённых спраў,
крылаў Ікаравых не змайстраваў.
Не падставіў плячо, не падаў руку
з удзячнасці за навуку…

А прыйшла да Лойкі жанчына —
яна не ведала, кім быў Скарына…
Калі тонеш, хапаешся за саломінку.
Лойка прыдумаў,
што любіць простую слонімку…
Кнігі, узоры, прасторы… музыка…
Лойка навучыўся падаць на муліцах
перад тым, невідочным, выраем,
у які паляцеў… і вынырнуў
на святло — і вярнуўся вуліцай…

Шлях, дарога, сцяжына, лаз…
Бессмяроцце. Покуць. Імжа.
Дыхнуў — сарваўся ў экстаз.
Жыве Беларусь! — і жыве душа!

На вайне

Усё жыццё мы тут на вайне,
вайна грукоча ў сэрцах на дне.
Вайна тут нікому не навіна:
першай сусветнай марылі бацькоў,
нас замарыла другая вайна…
І на першай сусветнай, і на другой
мы ваявалі самі з сабой.

А не было нам яшчэ двух год,
калі на Захад пайшоў Усход,
на Загасцінцы падняўшы пыл,
прагнаўшы сонца за небасхіл…

А не было з паловай трох год:
па спелым жыце, праз Гаўю, у брод,
з Захаду танкі пайшлі на Ўсход…
а я схавалася за цётчын плот…
Пражэрны пражэктар зыркім агнём
ад Ліды знайшоў мяне пад сталом…

Маю краіну, маю зямлю,
якой не маю, аднак люблю, —
схавала на дрывотні між дроў…
Прыйшла вайна, падпаліла зноў.

Была цямрэча — стала святло.
Чыя любоў пераможа зло?
Хто закалыша рунь, як дзіця?
Хто прадаўжае вайны праця́г?

Хто спяшаецца да струхлелых хат?
Хто гуляе з вайной у вясёлы тэатр?
Нельга так весела ваяваць,
воўчы сук вайны ў апілкі хаваць!

Чыста вакол, пазмяталі бруд.
А не ўсіх вайна пазмятала тут.
Кожны жывы герой-франтавік
вайну перапісвае на свой чыставік…

А тыя, якіх не было на вайне,
яны выйграваюць вайну ўдвайне:
яны вяртаюцца тут панаваць,
ні рукі, ні ногі ім не баляць…
Іх справы самі робяцца зноў
за іх саміх і за іх сыноў.

Самабічаванне

Каб абмануць сваё гора,
сэрца Маці-Радзімы вырвалі,
апрануліся ў скуры ворагаў,
пераліліся ў іх і загінулі…

Беларусь — нявольні Краіна.
Каб жыць тут, трэба загінуць.
Беларусь — чужых войнаў дарога…
Каб жыць, трэба трапіць да Бога.

З нас усе прывыклі смяяцца.
Нас яшчэ не б'юць, мы хаваемся.
Тут каб жывымі застацца,
адразу падпісвай капітуляцыю.

Але моцныя мы, арэшкі,
вяртаемся ройна ў свой вулей,
таму, што ўсе грэблі, сумежкі
пераплаканыя матулямі…

Зязюля крыжыкам вышывае
меткі, у якіх гняздзечках хавае
сваіх нявылупленых птушанят…
Яшчэ нас, такіх, шмат…

Маналог уладаркі склепу

У склепе мяне нарадзіла мама,
склеп мой на два паверхі.
Першы паверх — глыбокая яма,
другі — страха ў паднябессі.
Усе мае смуткі, згрызоты, цярпенні
праходзілі ў тым скляпенні.
Дажджу і аблокаў песні —
ў салодкім водары плесені.
Мяне называлі Стракозкай,
Склепкай, Саломінкай боскай.
Паілі мяне, як цялятка, з соскі
па чарзе шкадавальніцы з вёскі.

Былі ў мяне два таты,
ды яны аб гэтым не ведалі.
На хутары жыў дзед барадаты,
мяне туды «замуж выдалі…»
Калі я за дзеда замуж выходзіла,
было мне пяць годзікаў…
Мой жаніх-дзядуля быў добры:
карміў аладкамі з мёдзікам,
сунічкамі і сырадоем…
Падараваў мне кужэльную світку,
спёк на лісцейку ў печы духмяны хлеб…
Аднойчы перастаў дыхаць на досвітку.
Я ўцякла і схавалася ў склеп.

Шмат сірочых прайшла асяродкаў.
Ва ўнівер прынялі мяне, як сіротку.
Я працавала пісаркай і пісацелькай,
і настаўніцай, і выхавацелькай,
і уніяткай, і катэхеткай,
і прыбірачкай, і дармаедкай…
У хоры спявала святыя песні.
Па першай групе далі мне пенсію…

Калі мамы не стала,
брат не пускае ў склеп…
Кажа:
— Пайшла ты
на ўсе чатыры… у стэп!

…У склепе найлепей…
Калі тушацца ў вёцы агні,
Рыцар збройны на белым кані
з мечам і тарчай
штовечар ад месяца скача…
І няхай сабе конь-агонь
ранкам ператворыцца ў клячу,
якая траву каля склепу скубае, —
мне ўсёроўна добра, я плачу.
Мне гэтага шчасця хапае!

На горачцы

Удалося мне ад балота
неяк пражыцца на горачцы…
Кожная адкінутая адзінота
напіваецца ў горадзе горачка.

Места загараецца
нерытмічна, рыўкамі,
брукае, брыкаецца,
падае касой на камень.

Гэта не Варшава Твардоўскага Яна,
гэта Горадня, у асфальт укатаная…
гэта не Смаленск Аляксандра Твардоўскага,
гэта Горадня, старасвецка-калгасная вёска
і места касцёльна-польскае.

Як я тут прышчапілася да старажытнай
чарэшні,
як я прыбілася да прыбяднялак старэйшых,
прыкінулася нявіннай авечкай,
забалочанай рэчкай,
пасвенчанай свечкай-грамнічкай,
наіўнай дурнічкай?!
У зман уявла іх усіх
і сама сабе неяк паверыла,
што я з гэтага крутога скалістага берага,
з віру гэтага, стромкага, стромага,
што я не з-пад сходу сонейка
прыплыла па цячэнні Нёмана…
туляняюся тут не сёння…
праз мяне тут ніхто не сохне.

…толькі, чаму так, праз смутак,
Невідочны Нехта, бывае,
імя маё вымаўляе:
— Да-ну-та!

Сустрэча ў чаўне Харона

Элегія



Алесь БЫЧКОЎСКІ

У гэтым свеце бракуе яснага неба. Тут сонца свеціць зусім па-іншаму. Яно ледзь-ледзь прабіваецца скрозь туман і падфарбоўвае марудныя хвалі цёмнай рачной вады, якая пераліваецца на розныя лады то барвовым, то бледна-фіялетавым колерам, і гайдаецца-плыве ўздоўж стромкіх берагоў. Часам узнімаецца вецер. Ён то цярэбіць рэдкае сухое галлё, прынесенае з ляска, за якім калючы дрот, то гоніць густыя, нібы кісель, хвалі, якія неахвотна плюхаюцца па чорнарэччы, то ледзь штосьці шэпча ў вуха, то перамешвае-ўзбівае дурманісты пах навакольнай травы.

Процілеглага берага адсюль не відаць з-за туману. Там квітнеюць сады, поўныя райскіх птушак, край муз і натхнення. Трыма словамі: запаветная краіна мараў, у якую можна трапіць адно ў думках, ну або папрасіцца ў каменны човен паромшчыка. Кажуць, там жыве фантазія ва ўсіх сваіх мудрагелістых праявах і формах.

Так, цераз раку рэгулярна перапраўляецца човен. Выдзеўбаны з чорнага каменю, даўжэзны і шырэзны, човен незразумелым чынам трымаецца на густой вадзе і крыху пагойдваецца, калі ахвотнікі перабрацца на другі бераг ступаюць на шурпатую цёмную паверхню. Іх заўсёды хапае ўдосталь. Адметная рыса: з таго берага назад ніхто не вяртаўся, ніколі. Таму тое, што адбываецца за туманам, было загадкай. Хаця мне здаецца, я трошкі крывадушнічаю. Калі за туманам на тым беразе знаходзіцца краіна фантазій і мараў, то пра падзеі ў ёй можна даведацца з кніжак, пераважна фантастычных. Але што ёсць фантастыка, калі не скажоная рэчаіснасць? Аднак тут з якога боку паставіцца…

Мне ўсё свярбела паглядзець у твар паромшчыку. Калі цёмная постаць, шчыльна захінутая ў плашч, набліжалася ў чаўне, я намагаўся зазірнуць пад капюшон таямнічаму стварэнню. З кожным разам беспаспяхова.

Існавала легенда, што твар паромшчыка можна разглядзець толькі тады, калі сам апынешся ў чаўне, і ніяк не іначай.

Таксама паданне сведчыла, што і паромшчык насамрэч чыясьці выдумка, быццам бы неверагодным чынам матэрыяльна ўвасобленая ў нашым свеце. Так гэта ці не — людзі аб тым не ведалі. Але ўсе пагаджаліся з тым, што без паромшчыка на той бераг не трапіць, хіба толькі ў думках.

…Здаецца, тады метэарыт упаў у выток Нёмана. Альбо трубы архіанёлаў загулі ў нябёсах недзе над Уздой і Стаўбцамі. І вада ў Нёмане на хвіліну зрабілася чырвонай, як хто фарбы напусціў ці то соку таматнага націснуў. Штосьці зварухнулася ў той момант у наваколлі. Бабулі пачалі рыхтавацца да канца свету, і жыццё неяк навогул заціхла. Можна было і на працу не хадзіць, але хадзілі па-звычцы ды каб хоць нечым сябе заняць. Увесь Нёман тады накрыўся туманам, непраглядназ цяжкай запавесай-сцяной. І прастора выгнулася так, што з абодвух бакоў Нёмана быў ГЭТЫ бераг, а за туманам схаваўся выключна бераг ДРУГІ, і патрапіць туды можна было, паўтаруся, у каменным чаўне.

Як растлумачыць? Паспрабую прасцей. Чалавек сядаў у човен да паромшчыка, і той кіраваў да сярэдзіны ракі і тамака ў непраглядным тумане знікаў. Затым вяртаўся, толькі ўжо без спадарожніка. Мы памяркоўна разважылі, што паромшчык — злыдзень, топіць нашых наіўных небарак, якія мараць трапіць у шчаслівы край за туманам. Мне нават адна песня выплыла на памяць з назвай «Карабель дурняў». У ёй спяваецца пра добрых людцоў, якія вырашылі ачысціць свет ад блазнаў, сабраць іх усіх у карабель, вывезці далёка ў мора і ўтапіць. Прыпеў там дужа «ладны»: «Не спяшайцеся, месца хопіць усім!». І ў гэтым святле ветлівая гасціннасць паромшчыка выглядала дужа падазронай.

Так і было: хто плыў на пароме на ДРУГІ бераг, той знікаў у тумане назаўсёды. Дасведчаныя людзі шукалі навуковае абгрунтаванне і знаходзілі! Анамальная з'ява на Нёмане магла тлумачыцца толькі наяўнасцю разлому ў прасторы-часу. Тое значыла, што кліенты паромшчыка знікалі ў іншым вымярэнні. Але ж пакіну разбіраць загадку навукоўцам і не стану загрувашчваць аповед тэрмінамі. Не тое галоўнае цяпер. Важна іншае: адкуль мы ўсе даведаліся, што за туманам хаваецца краіна мараў, мрояў і размаітага шчасця? Вынікала, нехта ж вяртаўся адтуль і расказваў. Аднак — не. Напачатку, яшчэ да калючага дрота, паромшчык быў гаваркім і сам распавядаў пра цуды краіны на ДРУГІМ беразе. За перавоз ён прасіў манетку.

Хітрыя вайскоўцы спрабавалі перабрацца на іншы бок без дапамогі паромшчыка і дзеля эксперыменту паднялі ў паветра пару знішчальнікаў з надзеяй вярнуць назад. Ага, скулля! Летакі зніклі ў густых туманных клубах. Адтуль ніхто і нічога не вярталася.

Насельніцтва ж краіны пакрысе менела: многія спакусіліся аповедамі паромшчыка і сядалі ў човен, каб патрапіць у запаветны край і знайсці шчасце на ДРУГІМ беразе. Навукоўцы памаракавалі сабе і зрабілі выснову, што даследаваць цікавую з'яву не хапае фінансавання. Прыйшлі неяк агулам да думкі, што трэба жыць далей, не гледзячы на нёманскі феномен. Калі ніхто не вяртаецца з ТАГО берага, ГЭТЫ бераг спехам абнеслі калючым дротам і начапілі шыльдачкі «Небяспечная зона». Дзея была імгненна ўхвалена радай ветэранаў і вядомай грамадскай моладзевай арганізацыяй. Бо калі ўсе людцы паспалітыя рынуцца за туман у край мараў, хто ж тады працаваць застанецца і мацаваць дзяржаву, выконваць планы з дырэктывамі-пастановамі? Таму да калючага дрота следам яшчэ і кантрольна-прапускныя пункты дадалі. Ага, мы ахоўваем не зону ад вас, а вас — ад зоны! Ну а каб увесь свет не вінаваціў нас у адсутнасці дэмакратыі, «там, дзе трэба» вырашылі ўсё ж выпускаць невялікімі партыямі тых небарак, хто хоча ў каменным чаўне праплыць у адзін бок.

Адны прытварыліся, што працуюць, другія прытварыліся, што плацяць заробак, трэція прытварыліся, што кіруюць працэсамі, чацвёртыя прытварыліся, што пішуць праўду, і далей пералік ужо бясконцы

З улікам абставін у краіну фантазій вырашылі найперш адпускаць пісьменнікаў. А навошта яны тут? Каб лухту ўсялякую сачынялі? Хай лепей ужо сплывуць падалей…

Праўда, належала спачатку перад спецыяльнай камісіяй даказаць, што ты пісьменнік. Тут ужо іншая праблемка малявалася. Тым, хто меў чырвонае пасведчанне чальца творчага саюза ды па дзясятак выдадзеных кніжак у актыве, ды размаітыя прэміі, у тым ліку і дзяржаўныя, — вось тым зусім не свярбела падацца ў край, з якога няма вяртання. Нават у якасці эксперымента. Наадварот, трапіць у каменны човен імкнуліся невядомыя ўзнёслыя асобы, якіх не ўносілі ў выдавецкія планы, і ў каго не было грошай надрукавацца самвыдатам. Яны не маглі даказаць нічым, што таксама пісьменнікі, і спецыяльная камісія іх не прапускала. Верыць ім на слова? Тады зноў праблемка. Гэта ж любы беспрацоўны лайдак, гультай і п'яніца можа прытварыцца пісьменнікам-творцам і, не заплаціўшы адпаведнага падатка, пакінуць краіну. Як жа быць? Думалі-думалі і нарэшце прыдумалі!

Вырашылі прытварыцца ўсёй краінай, што таго ДРУГОГА берага проста не існуе. І не было ніколі. І раку Нёман увогуле не тое каб выдалілі з мапаў, а проста выключылі з інфармацыйных стужак і нават са школьнай праграмы, хутка перапісаўшы падручнікі, дзе «забыліся» ўзгадаць. Хто яго ведае, ці быў у нас Нёман той калі, ды з невядомым берагам, ці то проста паданне з сівой даўніны? Міне два-тры пакаленні, ніхто пра ДРУГІ бераг не ўспомніць. Пастанову прынялі, а калючага дрота, праўда, не знялі. Навошта? Забароненая зона.

Праўда, замежным крыніцам і ўсялякім інтэрнэтам іртоў не заткнеш. Плявузгаюць пра наступствы падзення метэарыта і гуд трубы архіанёла. Нёман жа далёка за межы краіны цячэ. У тыя краіны, дзе ДРУГІ бераг афіцыйна прызнаны. І хай сабе. Усім добрасумленным суайчыннікам вядома, што заходняе тэлебачанне хлусіць, у прадажных журналістаў адна мэта: разгайдаць і разбалансаваць нашы пракаветныя каштоўнасці.

Так і жылі далей. ДРУГОГА берага ў нас няма. Краіны мараў дык і пагатоў ніколі не было. Таму нельга фантазаваць, працы непачаты край: бульбу сеяць, кабаноў гадаваць, сумленна галасаваць на выбарах.

Толькі з таго моманту, як выкраслілі з жыцця запаветны край, любая работа стала нашаму чалавеку не ў асалоду. Гульня ў прытворства мела шмат наступстваў. Адны прытварыліся, што працуюць, другія прытварыліся, што плацяць заробак, трэція прытварыліся, што кіруюць працэсамі, чацвёртыя прытварыліся, што пішуць праўду, і далей пералік ужо бясконцы. Увогуле, усе наўкола прытварыліся, што ад іх нешта залежыць. Ну, гэта не ўпершыню ў гісторыі, таму не страшна, бо досвед маецца. Людзі развучыліся марыць.



Фота www.andreymishin.ru

Толькі паромшчык з каменным чаўном нікуды не знік і нікім не прытвараўся ў гэтай гісторыі. Ён заўсёды падплываў, калі які бадзяга-няўдачнік-боўдзіла-куёўдзіла выпадкова апынаўся на стромкім беразе і воляй звыш не затрымаўся на кантрольна-прапускным пункце (супрацоўнікі каторага, між іншым, даўно забыліся, навошта яны там пастаўленыя і каго ад чаго ахоўваюць ці абараняюць).

…— Ты зноў бяз грошай? — пачаў першым паромшчык. — Мне трэба заплаціць манетку.

Я развёў рукамі. Маўляў, адкуль грошы ў сталкера? Забароненая зона з анамаліямі наш «сталкерскі» вывіх лёсу, гэта наш свет, наша маці і нашае ўсё. Але ж мне вельмі карціла патрапіць у невядомы край, і я жыў надзеяй адкрыць туды шлях.

— Як там? — пацікавіўся я.

— Па-іншаму, чым тут, — прабурчэў паромшчык.

Я ўздыхнуў і прыняўся маляваць пальцам па пяску. Выпісваў розныя знакі. Потым зачэрпнуў жменю і паднёс да твара. Тоненькія струмні пацяклі скрозь пальцы.

— Скажы, у гэтай рацэ можна ўтапіцца? — спытаў я.

Паромшчык, магчыма, і здзівіўся майму глупству, але выгляду не паказаў.

— Не ведаю, — ён паціснуў плячыма. — Мабыць, нельга. А ты паспрабуй… — нечакана прапанаваў ён.

Я прывык да выказванняў паромшчыка.

— Я перавозіў шмат творцаў, ніхто ні разу не цікавіўся, ці можна ўтапіцца ў вадзе мрояў. Дзіўны ты, смяротны.

Задумаўся міжволі. Сітуацыя складвалася дэпрэсіўная, выдуманая кімсьці. Я зірнуў назад. Далёка ляжаў горад, змрочны да дурнаты і нерэальны, нібы яго і не было на свеце. Адзін з сотні правінцыйных гарадоў без надзеі на штосьці лепшае. Хоць на тысячагоддзе застынь у чаканні, нічога ў наваколлі не зменіцца.

— Слухай, у мяне грошай няма.

— Тады вяртайся назад, — быў сухі адказ.

Я павагаўся.

— У мяне ёсць штосьці большае, чым грошы. Што, калі я распавяду табе цікавую гісторыю ці павучальную казку замест аплаты?

— Дык ты таксама творца? Чаму адразу не сказаў? Калі ласка! — запрасіў паромшчык і саступіў праход.

Нечакана для сябе я ступіў у човен. Нічога не змянілася, толькі вецер дзьмухнуў мацней, зрываючы капюшон з галавы паромшчыка.

І я нарэшце пабачыў яго ў твар.

На мяне глядзеў я сам…

На апошнім паверсе



Ярына ДАШЫНА

Кветка

*Ты ведаеш, мама, у гэтым вянку
я кветка, зламаная ў пазванку, —
схіляюся долу
пакорліва.
Повязь усіх і ўсяго —
мы нейтралізуем адно аднаго
і робім бясполымі…
Мама!
Здаецца, тут бачыцца дно,
здаецца, што мы памерлі даўно
ў гэтым спляценні.
Здаецца,
мяне ў купальскім вянку
спусцілі, зламанай у пазванку,
уніз па цячэнні…*

* * *

*На апошнім паверсе маёй адзіноты —
пад мінус дваццаць.
Так высока яшчэ ніхто і ніколі,
ніхто і ніколі…
Адусюль можна ўбачыць трубы
электрастанцый,
дымок уздымаецца ў нябесныя столі.
У перыяд распаду на часціны-часціцы,
табою перахварэла, рукі прэч
ад майго Бога.
Я вывучыла на памяць усе тваё небыліцы:
танную белетрыстыку,
папуры-некралогі.
Ад таго, што ў гэтых пачуццяў тэрмін кароткі
дзеяння і гарантый няма фізічных,
у сваёй безвыходнасці, сто адсоткаў,
я пamру ад хвіліннай пяшчоты ішэмічнай.
На апошнім паверсе маёй адзіноты —
пад мінус дваццаць.
Я да неба даўно прырасла дагары
каранямі.
Мама сніцца балюча жывою.
Час прачынацца —
усюды, дзе сонца рэнтгенаўскімі
прамянямі.*

* * *

*Занатуй мяне ў сваім сэрцы.
Крэйдаю, крывёю, пацалункам.
Кожную хвіліну, кожны подых
буду слухаць я яго біццё.
І табе ўжо не будзе балець.
Зажыўляю перакісам слова.
Я з табой заўсёды буду побач
на халодным нашым страшным
дне.*

*Мне знаёмая з дзяцінства бездань.
Я праходзіла ўсе
лабірынты страху, забівала ў пячорах
цмокаў адзіноты і тугі.
Цьмяным і шчымлівым сэрцасумам:
успамінам, дотыкам і
пахам занатуй у гэтую рэальнасць…
каб у ёй застацца да канца.*

* * *

*Цемра — як цішы бясколерны атрыбут.
Успыхваюць душы анёлаў у зорным
суквецці.
Мне ўвесь час здаецца, што я ўжо тут,
што я ўжо здарылася ў гэтым Сусвеце.
Высакамоўна цвыркун адпявае ноч
у такт гарадской шашы — пульсуючай
вене.*

*Звярні ў правулак
і моўчкі прайдзі наўзбоч
ценем…*

* * *

*Бог нешта гаворыць мной і табой,
усёю пяшчотаю і брыдотаю ўсёй,
што паміж намі…*

*Гэты паверх зямлі
перанаселены тымі,
хто пакуль жывы.*

*І толькі мы нібыта з табой
усёй пяшчотаю і брыдотаю ўсёй
сябе забілі…*

* * *

*Анёлы ажурныя крылы свае раскрылілі —
любуюцца, бесцялесыя, у люстра сабой.
У іхняй анёльскай краіне — Белай Крывіі,
напэўна, зусім не хапае пяшчоты зямной.*

*А мой, аднакрылы, сядзіць
ля нябесных варотаў —
стварае з аблокаў ружовыя вітражы.
Ён быў пакараны Ўсявышнім
за бездань палёту
і прывязаны да грэшнай маёй душы…*

* * *

*Калі ўжо немагчыма быць нечыёй —
прыдумай сабе Айчыну, жыві ў ёй.*

*У ёй нараджай дзяцей, у ёй памірай…
Калі ўжо немагчыма, то абірай
кім быць, кім здавацца, кім
звацца…*

Рыбы чуюць тваё маўчанне



Таццяна НЯДБАЙ

* * *

*Горад, дзе
Вызначаў маяк
Кірункі і арыенціры*

*Горад, дзе
Ты казаў мне «мая»,
Забаўляючыся ў ціры*

*Горы дзеляць,
Стаяць сцяной,
Не ссунуць іх, што б ні рабілі мы*

*Горкі прысмак
Сваіх надзей
Заядаю рабінамі*

*Восень імжыць
І спявае блюз
У лахманах рыжых*

*Там, дзе я
Цябе не люблю
Я не змагу выжыць*

* * *

*паміж вечарам і вечнасцю
розніцы асаблівa няма —
яны стаяць цяпер за тваёй спінай,
па-панібрацку паляпваючы па плячы,
таму разняволься і ўсё ў абдымкі прымай,
не ўнікаючы — кулі ці кулічы
ты рыхтуешся заўтра без допінгу
здзейсніць скачок,
таму што трыпутнік не прыкладзеш
да горычы без падставаў,
таму што чакаеш, што хтосьці
прыйдзе падставіць плячо,
а потым употай дзякуеш, што не падставіў
у сутонні асаблівa востра
адчуваеш мяжу ўсяго,
лінія жыцця супадае, таючы,
з лініяй далягляду,
штосьці вяpэдзіць, нібыта блізкая
прысутнасць Яго,
таго, хто небакрай адхінае
на Дзяды і Каляды
паміж вечарам і вечнасцю
выбару асаблівa няма,
паміж выбарам і выраем, наадварот,
пралегла вечнасць,
рыбы чуюць тваё маўчанне,
і можаш рашаць сама,
калі класціся спаць, калі пакідаць веча*



Фота www.digitaltrends.com

* * *

*калі ты гаворыш, што горы,
як коткі,
акруглішы спіны,
пілі мора,
не баючыся вады,
а яно было ласкавым, туманным,
парным, як сырадой,
то намагаешся не абмовіцца,
як трымаў мяне за руку
калі ты распавядаеш,
што найлепшая кава ў тым месце —
за гатэлем прынцэсы Луізы,
то намагаешся не згадаць уголас,
як п'янкое віно з келіха
перацякала ў заход сонца,
а потым — назад у келіх,
каб захмяліць нас і застацца
слядамі на вуснах
усе слухаюць раскрыўшы раты
(і я таксама),
як выдмы, перацякаючы, мяняюць формы,
застаючыся з намі — у нашых кішэнях,
на зубах,
у сэрцах,
але і ў майстэрскім пазбяганні займеннікаў
першай асобы множнага ліку —
як сцяжкоў на аўтадроме,
як буйкоў на вадзе
калі ты глядзіш на мяне, я часам баюся,
што табе і сапраўды ўдалося —
забыць*

* * *

*дай мне тое, што ты не даваў нікому,
і што — ніхто мне
дай мне шал і лютасць адстойвання
нашых сноў,
перамогу і стому, якія мяжуюць з комай,
і падатлівасць, у якой мы тонем,
дай мне тое, што ляжа ў падмурак асноў
не шкадуй і не бойся —
няма ні джала, ні куляў,
але я ўглядаюся ў студняў гулкі адчай,
покуль ты не прыйдзеш,
пакуль мяне не прытуліш,
а калі прыйшоў —
сядай, завару чай
і змаўчу пра тое, што недзе на дзікай выспе
развіднела і цені спаўзліся ў далёкі кут,
бо тым часам яблыкі побач з домам
выспелі
і палын за рогам гаркавейшы ад цыкут
і мы тут*

* * *

*сцішаны шоргат мая
лісцік мяты ў махіта
цябе і мяне прымае
маўклівая глыб блакіту
дзе след самалёта паволі
рыбіным тае шкілетам.
затухаюць магноліі
распаляецца лета*

* * *


*Тое, пра што немагчыма маўчаць
і сказаць немагчыма.
Мы набіраем паветра ў сэрца
і ім крычым мы.
Хай хтосьці адкажа, чаму, за што і —
ўрэшце — прычым мы?
Схавай насоўкі, яно насоўваецца
без дай прычыны.
Наступны прыпынак праз вечнасць,
дык едзь і маўчы мо
ці — нейтралізуй наступствы,
ўсміхайся і лыпай вачыма.*

*Цягнік нясе, мы ўсе ў адным вагоне,
і дзякуй, што побач,
не бачна неба, але пра яго раскажуць
парах ці пробашч.
Прышпільвайся і трымайся, зрабі хоць
спробу.*

*Хоць часам таго, што ў руках,
не ўтрымаць, праз шкельцы
плыве вясновымі ручаямі радасць тапельцаў.
Дай кожнай сястры — па тоне спакою,
братам — адвагі і
нам усім бы цяпер прыдаліся
здольнасці ў магіі.*

*Не зазірай, калі ласка, ў сябе,
каб не ўбачыць прадоння.
Прабач,
мы ўжо пралілі віно.
Мы ўсе тонем.*

Вершы прозай з кнігі «Азарэнні»



Арцюр РЭМБО

Раніца

Я абняў летнюю раніцу.

Нерухомыя, спалі аблiччы палацаў. Мёртваю была вада. Цені вартавалі лясную сцяжыну. Крочыў я — і ажывалі цёплыя подыхі, і міргалі дыяменты, і ціхутка ўздымаліся крылы.

Першай падзеяю сталася кветка, што нашаптала мне імя сваё на сцежцы, па якой рассыпалася халаднавата-цьмянае зіхценне.

Я засмяяўся светлакосаму вадаспаду, які кудлаціўся скрозь голле яліны, і на срэбнай вяршыні яе ўгледзеў багіню.

I стаў зрываць адно покрыва за другім. Ідучы дарогаю, рассоўваў іх рукамі. Мінаючы поле, расказаў пра раніцу пеўню. А яна ўцякала гарадам між званіцамі ды цэрквамі, і я, туляючыся жабраком па мармуровай набярэжнай, даганяў яе.

Напаткаў на сыходзе сцяжыны, ля лаўровага гаю, і, ахутаўшы покрывам, адчуў яе бязмежнае цела. Так мы заснулі на ўзлеску, раніца ды дзіця.

Я прачнуўся — і быў поўдзень.

Адбыццё

Даволі бачыў. Відзежа прыходзіла ў розных аблiччах.

Даволі чуў. Гоман гарадоў увечары, й на сонцы — і заўжды.

Даволі зведаў. Спыненні жыцця. О гукі і здані!

Адбыццё — ў новыя шумы і пачуцці!

Марына

Калясніцы са срэбра і медзі,
Насы караблёў са сталі і срэбра,
Пену ўзбіваюць,
Уздымаюць карэнне кустоўяў.
Плыні пяскоў,
Каляіны адліву бяскрайнія
Цякуць кругамі на ўсход,
Туды, дзе пáлі лясоў,
Туды, дзе наспаў калоны,
А кут іх віхры святла рассякаюць.

Сказы

Калі цэлы свет стане чорным лесам для дзвюх пар нашых здзіўленых вачэй, марскім берагам для двух верных дзяцей, музычным прыстанкам для нашай светлай прыязні — я знайду вас.

Няхай будзе ў гэтым свеце адзін стары, ціхі і прыгожы, атачаны «неверагоднай раскошаю» — і я ўкленчу перад вамі.

Хай бы спраўдзіў я ўсе вашыя ўспаміны, хай быў бы тою, што можа вас моцна звязаць — і я задушу вас.

***

Калі мы мацнейшыя за ўсіх — хто ж адступае? Калі нам весела — ад смеху хто памірае? Калі абураныя, хто нам перашкодзіць?

Апранайце строі, танцуйце, смейцеся — я ніколі не здолею выслаць Каханне за дзверы.

***

— Мая сяброўка, жабрачка, дзіця-пачвара! Якая безуважная ты да гэтых няшчасных, і гэтых свавольстваў, і маіх бянтэстваў. Прыхініся да нас тваім неймаверным голасам, тваім голасам! што адзіны лашчыць сярод гэтай агіднай роспачы.

Пахмурная раніца, ліпень. Смак попелу ў паветры; — водар дроваў, што прэюць у печы, — мочаныя кветкі, — выкрадзеныя прагулкі, — імжа каналаў паўз палі, — тады чаму не забаўкі і не духмянасці?

***

Я працягнуў канаты ад званіцы да званіцы, гірлянды ад вакна да вакна, залатыя ланцугі ад зоркі да зоркі, і — танчу.

***

Верхні стаў безупынна курэе. Што за чараўніца паўстане на белым заходзе? Што за бэзавая лістота апусціцца долу?

***

У той час, як дзяржаўны скарб сплывае ў святкаваннях братэрства, ружова-вогненны звон звініць між аблокаў.

***

Вяртаючы прыемны смак чарнілам, чорны попел лагодна дажджыць на маю бессань, — прыцішваю гарэнне лямпы, кідаюся на ложак, і, тварам да ценю, я бачу вас, мае дзяўчыны! мае каралеўны!

Дзяцінства

I

Гэты ідал, чарнавокі і жоўтавалосы, без бацькоў і двара, высакароднейшы за мексіканскую ці фламандскую казку; яго ўладанні — дзёрзкі блакіт і зяленіва — сцелюцца затокамі, чые хвалі не зведалі караблёў і што носяць таму лютыя грэцкія, славянскія, кельцкія імёны.

На ўзлеску — кветкі мрояў дзынкаюць, мігцяць і зіхцяць, — і дзяўчынка з апельсінавымі вуснамі, з каленямі накрыж у светлым разводдзі, што бруіцца з лугоў; галізна, якую ахінаюць, працінаюць і апранаюць вясёлкі, расліны і мора.

Дамы, што кружацца на тэрасах блізу мора; дзяўчынкі і волаткі, прыгожыя мурынкі ў полельна-смарагдавай пене, самацветы стойма на пульхнай глебе гаёў і расталых садоў — юныя маці і дарослыя сёстры з вачыма, поўнымі паломніцтваў, султанкі, князёўны з тыранскімі звычкамі і строямі, маленькія іншаземкі і людзі з лёгкім сумам.

Што за нуда, час на «роднае цела» і «роднае сэрца».

III

Улесе ёсць птушка, чый спеў вас спыняе і змушае вас чырванець.

Ёсць гадзіннік на вежы, што не вызвоньвае час.

Ёсць дрыгва з нарою белых звяроў.

Ёсць сабор, што ідзе на дно, і возера, што ўздымаецца.



Фота www.mamabarsika.com

Ёсць дзіцячая павозка, пакінутая ў ляску, або тая, што коціцца сцежкаю, застужкаваная.

Ёсць трупа маленькіх акцёраў у строях, што мільгаюць на дарозе праз узлесак.

I нарэшце, калі мы галодныя і сасмаглыя, ёсць хтосьці, хто цікуе за намі.

IV

Я — святы ў малітве на горнай прыступцы, а лагодныя звяры пасвяцца аж да Палесцінскага мора.

Я вучоны ў цёмным фатэлі. Галіны і струмені дажджу разбіваюцца аб вокны бібліятэкі.

Я мінак на вялікай дарозе паўз нізкія дрэвы, роў шлюзаў сцішае мае крокі. Я доўга сачу за маркотным паласканнем у золаце заходняга сонца.

Я мог быць тым дзіцём, пакінутым на грэблі сярод мора, тым маленькім служкам, што крочыць прысадамі і макаўкай кранаецца неба.

Абрываюцца сцежкі. Узгоркі травеюць жаўтазеллем. Дранцвее паветра. Птушкі й крыніцы усё далей! Гэта можа быць толькі канец свету, там, наперадзе.

Being Beauteous

Насупраць снегу — Уцялесненае Хараство высокага росту. Шыпенне смерці і віхры прыглушанай музыкі вымушаюць уздымацца, шырыцца і трымцець, нібы здань, гэтае за ўсё даражэйшае цела; пунсовыя й чорныя раны разрываюць прыўкрасную плоць. Ясныя фарбы жыцця гусцнуць, скачуць і развейваюцца наўкола Мроі падчас стварэння. I трапятанне ўзносіцца і гудзе, і ўтрапёны водар гэтых з'яў поўніцца смяротным шыпеннем і хрыплай музыкай, якія свет, далёка за намі, ускідае на маці хараства, — яна адступае, выпростваецца. О! нашыя косці пакрывае новая закаханая плоць.

***

О попельнае аблічча, шчыт кудзераў, крышталёвыя рукі! Гармата, на якую я мушу рынуцца скрозь бойку дрэў і бязважкага ветру!

Бессані

I

Вось азораны спакой, ні гарачкі, ні знямогі, у ложку ці на лузе.

Вось сябар, ні палкі і ні млявы. Сябар.

Вось каханая, ні мучаніца, ні мучыцелька. Каханая.

Вецер і свет, нікім не шуканыя. Жыццё.

— Ці было гэта ўсё?

— I свяжэе сон.

II

Асвятленне сягае кроны збудавання. З двух канцоў залі — размаітыя ўпрыгожанні, суладныя зрэзы злучаюцца. Сцяна перад назорцам ёсць псіхалагічнай паслядоўнасцю палос фрызаў, зонаў атмасферы і геалагічных асноваў. — Густыя і хуткія сны чуллівых барэльефаў з істотамі самай рознай прыроды ў самых розных абліччах.

III

Лямпы і дываны бессані хвалямі шумяць уначы, уздоўж корпуса і вакол кармы.

Мора бессані, нібы грудзі Амелі.

Кілімы да паловы вышыні, густалессе карункаў смарагдавага адліву, куды зрываюцца галубіцы бессані.

....

Пліта чорнага каміну, сапраўдныя сонцы пясчаных выдмаў — ах! крыніцы чараў! Адзіны від на світанне гэтым разам.

Краскі

З залатой прыступкі — між шаўковых стужак, шэрага шыфону, зялёнага аксаміту і дыскаў крышталю, што адлiваюць чорным, як бронза на сонцы, — я бачу, як раскрываецца наперстаўка на дыване са срэбранага ажуру, вачэй і кудзер.

Часцінкі жоўтага золата ўроссып па агаце, калоны чырвонага сандалу — апорай смарагдаваму купалу, букет белага ядвабу і тонкія атожылкі рубіну абвінаюць вадзяную ружу.

Як нейкае боства з вялізнымі сінімі вачыма і целам снегу, мора і неба вабяць на мармуровыя тэрасы безліч юных і моцных ружаў.

Метрапалітэн

Ад праліву ў танах індыга і да мораў Асіяна, на ружовым і аранжавым пляжы, абмытым вішнёвым небам, узняліся і перасякліся крышталёвыя бульвары, неўзабаве занятыя маладымі і беднымі сем'ямі, што закупаюцца ў гандляроў зелянінай. Ні следу багацця — горад!

Ад асфальтавай пустэльні імчаць бязладна напрасткі — з палотнамі смугі ў брыдкіх зборках на небе, што выгінаецца, адхіляецца і ападае, зробленае з такога злавеснага дыму, на які толькі здатны Акіян у жалобе, — каскі, колы, лодкі, коні — бітва!

Уздымі галаву — драўляны мост аркаю; апошнія гароды Самарыі; пярэстыя маскі пад святлом ліхтара, пасечанага холадам ночы; блазнаватая русалка ў шапатлівай сукенцы на дне ракі — чарапы, што свецяцца на гарохавым полі — ды іншыя фантасмагорыі — вёска!

Дарогі, аточаныя мурамі і агароджамі, што ледзь стрымліваюць напор сваіх гаёў, і пачварныя кветкі, якія б ты назваў і сэрцамі і сёстрамі, Дамаск, што гняце знямогай, — уладанні казачнай шляхты зарэйнскай, японскай, гуаранійскай, па-ранейшаму прыдатныя для прыёму музыкі старажытных; і корчмы, якія назаўсёды не адчыняцца больш, і прынцэсы, і, калі ты яшчэ не знясілеў, вывучэнне зораў — нябёсы!

Раніца, якою вы, разам з Ёю, змагаліся, аточаныя ўспышкамі снегу, зялёных вуснаў, чорных сцягоў, блакітных промняў і пурпуровых водараў палярнага сонца — твая моц!

Масты

Шэрыя нябёсы з крышталю. Масты размаітай канструкцыі, гэтыя ідуць наўпрост, тыя — выгінаюцца, другія павісаюць і расходзяцца вугламі над першымі, і лініі іх паўтараюцца ў кожнай асветленай звіліне канала; і ўсё такое доўгае і бязважкае, што берагі пад цяжарам сваіх скляпенняў ападаюць і малеюць. Некаторыя з гэтых мастоў усё яшчэ пакрытыя хацінамі. Іншыя трымаюць мачты, знакі і хісткія парапеты. Мінорныя акорды скрыжоўваюцца і лятуць далей, струны цягнуцца з адхонаў. Відаць чырвоныя камізэлькі, а можа і іншыя строі, і музычныя інструменты. Што там, народныя песні, урыўкі шляхетных канцэртаў, недапеўкі патрыятычных гімнаў? Вада — шэрая і сіняя, шырокая, як марская пратока.

Белы прамень, падаючы з неба, абрывае камедыю.


Пераклала з французскай
Яўгенія Якубовіч

«Аблічча слоў»

95-ы нумар часопіса «Дзеяслоў» пачынаецца з фрагмента новага рамана Алены Брава «Садомская яблыня».

Усё як бы пазнавальна ў параўнанні з папярэднімі творамі пісьменніцы: унутраны псіхааналіз галоўнай гераіні, абсурдны лад савецкай рэчаіснасці...

Пакінутая мужам 42-гадовая жанчына мае сына, працуе ў журналістыцы. Натура творчая, самакрытычная, але залежная ад збегу абставін і ўласнага лёсу. Яна збірае сілы для ўнутранага супраціву квазііснаванню ў краіне з ідэалагічна-прасветленымі нормамі дэклараванага сацыяльнага жыцця. Стыль, у тон дзяржаўнай журналістыкі, прахалодны, нервовы, абрывісты. Мова актыўная, але сінтэтычная, роўнааддаленая як ад



літаратурнай, так і ад вуснай практыкі.

«Гэтая мова — інвазійная расліна і пустазеллем буяе ў галовах абарыгенаў, якія дня пражыць не могуць без свайго ўлюбёнца, тэлевізара. Разам з калегамі я сею атрутную мову з экрана. Насенне ўкараняецца ў барознах і майго мозгу, хоць я спадзяюся абараніць сябе, апранаючыся ў гідракасцюм іроніі. Я кплю з усяго, што ненавіджу. Кплю, калі сорам выядае мне вочы. Кплю з мёртвай тэлемовы. А назаўтра іду карміць сваёй крывёю, сваім мозгам жалезныя раты «развіцця», «прагрэсу» і, ясная рэч, «упэўненасці», якая жыве тут сумесна з «заўтрашнім днём». Пасмяротныя маскі зніклых сэнсаў <...>, словы грымяць сухімі гарошынамі ў бычыным пузыры, вырастаюць тэрыконамі шлаку на лузе жывой мовы».

Ну і спадар Фрэйд у падсвядомасці аўтаркі як заўсёды раскашуе...

Васіль Зуёнак, адзін са старэйшых нашых выдатных паэтаў, апошнім часам як бы прыспешвае сваё жыццё вершамі. У чарговай часопіснай нізцы ёсць творы злабадзённыя, напоўненыя рэаліямі цяперашняга часу, ёсць спавядальныя, самотна-іранічныя, але, трэба прызнаць, — усе яны прасякнутыя душэўнай мудрасцю. Як ні дзіўна, але і ў класічна-традыцыйных вершах не абыходзіцца без экзістэнцыі... Паэт такім чынам падсумоўвае вяршыню свайго чалавечага жыцця:

Свечкі хрышчэнне,
Воску свячэнне —
І матылёк:
Сеў, аднакрылы, —
Знакам магілы
Сэрца апёк.
Мілыя воблікі
Зніклі, як воблакі
Ў цемры начной.
Неба з зямлёю
Дзеляцца — двое —
Смерцю са мной...

У празаіка Уладзіміра Сціпана — мастацкая натуралістычная метафара, якая ўтрымлівае не шчымлівую загадку, а прытоеную недзе наводдаль разгадку (тут — і інтрыга, і заваражанасць, і сентыментальнасць, а то ўспамін, пераказ ці показка). Яго мініяцюры — як маналогавыя, так і дыялогавыя — разважныя і палемічныя. У. Сціпан — творца сціплы і сцісы, але адначасна таленавіта-выразны. Са сваім мастацкім (мастакоўскім) поглядам: «Ёсць моманты, калі жанчына робіцца неверагодна прывабнай... На балконе сохне бялізна. Вялікі цёмна-сіні абрус, белая прасціна, і яшчэ адна колеру жаўтка, а можа і гэта — вялікі святочны абрус. Палова неба цёмная, а другая чыстая. Пачынаюць ляцець зіхоткія кроплі дажджу. Вецер хістае бялізну. На балкон выбягае жанчына. Яна хапае бялізну, прыўстае на дыбачкі, выструньваецца, спяшаецца. Сцягвае цёмна-сіні абрус, потым жоўты... Вецер вырывае з яе рук белую прасціну ў цёмных плямах кропель, але яна яе ўтрымлівае... Вецер аблепліваe жанчыну вільготнай сляпуча-белай тканінай... Па паўнаватых плячах збягаюць кроплі». Што праўда, як аўтар, У. Сціпан занадта старонні да сваіх герояў. Ці не таму сям-там у яго мініяцюрах прасочваецца і нейкая нязводная аднастайнасць. Тут якраз да месца такі яго запіс: «Стары чамадан выглядае і змястоўна, і паэтычна, але ідзеш і набываеш новы».

Вельмі глыбокая, як вада ў старым калодзежы, у якога ўжо з'іржавеў ланцуг на калаўроце, нізка вершаў Фелікса Баторына. Далёкі бляск і прахалода зямной смагі жыцця прыцягваюць зрок і хваляюць душу. Ратуе да канца неўразумелы спадзеў:

Хоць і благае сэрца, не пяецца,
Як я ні дзьму то ў дудачку, то ў рог,
І цемрыва па-д'ябальску смяецца,
І ў бездані халодный плача Бог.

Аповесць Івана Клімянкова «Мажорны фінал» (самабытнага аўтара, са своеасаблівым бачаннем свету, які, на жаль, друкуецца вельмі рэдка) мае хітра закручаны шахматны сюжэт, на якім утрымліваецца інтрыга твора і ад якога сілкуецца сэнс усяго расповеда. Лёс, вырак, прадвызначанасць жыцця, як шахматная партыя, з нейчым выйгрышам і нейчай паразай. І выйгрыш, і параза заўжды справядлівыя, бо залежныя ад цябе самога.

«І, як ні дзіўна, недзе ў глыбіні свядомасці трымцела зусім беспадстаўнае, бязглуздае спадзяванне на нешта, нібыта можна было пазбегнуць непазбежнага. І ўзнікла яно не проста так, не на пустым месцы, а, як здавалася, выцякала з сутнасці і логікі быцця, з яго законаў, увесь час скіраваных дагэтуль на тое, каб даць упартаму нябогу зразумець марнасць яго пратэсту, змаганняў супраць наканаванага, давесці, што лёс належыць прымаць пакорліва і змірэнча, інакш ён напоўніцу дасць зведаць сваю бязлітасную жорсткасць. Калі не так, то навошта тады было яму здзеквацца з гэтага непакоры доўгія гады, нявечыць яго жыццё, каб напрыканцы даць пераможна зазірнуць мне, а найперш самому Лёсу ў вочы, пасміхнуцца знішчальна ўсмешкай пераможцы?».

Словам, твой выйгрыш — гэта ўсё ж нечая параза, сцвярджае аўтар аповесці.

Пошукі ў творчасці заўжды прыцягваюць чытацкую ўвагу. Тым больш у творчасці ўжо сталага і даўно вядомага аўтара. Людміла Паўлікава падрыхтавала кнігу інзін-секстэтаў (вершаваны цыкл з уласнай формай, якая вядзецца ад старажытнакітайскай сістэмы светасузірання, якой не меней за 5000 гадоў). Падобныя філасофскія тэксты бяруць пачатак ад даасізма і канфуцыянства. Яе ідэі знаходзяць прымяненне і ў сучаснай навуцы і мастацтве. Аўтар прывязвае свае тэксты да структуры традыцыйнага санета і шахматнай гульні (дошкі на 64-х клетках).

Не радуе пагляд аблога хмар.
Так хочацца ў жыцці дзівосных чар
святла, яго імклівых гульняў,
сноў каляровых і празрыстых мар!
Хаця... парой і ў цемры — так утульна!
Хаця... і ў цемры — шматаблічны твар.

Чытаючы аповед Вольгі Бабковай «Палата № 10», узгадвалася арыгінальная проза Марыі Вайцяшонак. Ёсць аўтар і аддаленае рэха слоў, што напаўняюць таямнічай аўрай камерную прастору акаляючага нас жыцця. Ствараецца дзіўная сітуацыя: «Словы і літары разбягаліся са сказаў, а пасля заскоквалі не на свае месцы. Поўны гармідар. Трэба было чакаць аўтара, які б вярнуў мне любоў».

Новыя вершы Крысціны Бандурынай, як кажуць, на аматара. У іх ёсць соль паэзіі, гэта бясспрэчна, іншая справа, што не кожны чытач прыме яе дозу... Гэта не для «дыетчыкаў» краснага пісьменства, але варта памятаць:

Бывае, што мора ў вершы —
абавязкова з дном,
падвоеным ці патроеным...
Бывае, што трэба верыць.
Рэжаш вусны і нёба
жорсткасцю языка,
эфемернасцю слоў заліваеш
драпіны і разломы.
Бывае, калі завісне рука —
як над бязмежнай пустыняй радка...
....
Бывае, што трэба любіць.

Шчыра-шчымлівыя ўспаміны пра адну з цікавейшых нашых паэтак Таццяну Сапач друкуе Адам Глобус. Узрушаныя памяццю пачуцці — мова запозненага паразумення. «Прачытаў і падумаў пра пасмяротныя зборнікі нашых лепшых паэтаў, пра кнігі Анатоля Сыса і Тані Сапач. Мне падаецца, каб яны спалілі свае юначыя практыкаванні, было б лепей. Сам я вершы і дзённікі паліць не буду. Прынцыпова. Так мяне вучылі разумныя выкладчыкі ў інстытуце — нельга зніштажаць свае творы. Вучылі і навучылі. Хай і пра мяне нехта жорсткі скажа: добра было б, каб і Глобус свае дзённікі спаліў, як той Танэда Сантока».

Спецыфічна-арыгінальныя вершаваныя тэксты берасцейца Яўгена Бяласіна вызначаюцца як філалагічнымі, так і філасафічнымі пошукамі, а таксама формамі выяўлення паэзіі з нутра самой аўтарскай істоты. Ёсць адметныя рэчы, як у творы «Ацалунак»:

я
п'ю цябе,
ты
п'еш мяне –

мы цалуемся,
мы ацаляемся,

мыстановімсяцэлым.

Гэткая мройлівая паэзія ў прозе (у мініяцюрах насамрэч). Ёсць думкі і одум, таямнічае і будзённае, «палёты ў сне і наяве»... Стыль сентыментальны. Віктар Чаропка пісаў гістарычныя раманы і эратычную прозу, цяпер шалі жыццёвага часу схіляюць яго да недастворанага, да горкага разумення чалавечай недасканаласці, у тым ліку і мастацкай... «Мы называем сябе рыцарамі, мы называем сябе князямі, а ваявалі заўсёды за спінамі ваяроў, падстаўляючы іх пад смяротны бой. І пад нашыя прыгожыя словы аб гонары і радзіме яны ішлі паміраць. Так вось мы і ваявалі. Вялікасветлы спадар, о мой вялікі князь, хай жа здрада праявіць сябе, хай б'юць кінжаламі і мячамі ў спіну браты і нашы жанчыны, як міласэрнасць прымем мы гэтую здраду, калі мы сябе не можам абараніць, калі няма каму быць смелым. А калі пашкадуюць, калі жалем захлынуцца іх сэрцы, хай нас знішчыць вораг — усіх да аднаго, каб і памяці ад нас не засталося, каб вецер разнёс нашыя імёны, а хіжыя крукі выдзяўбалі нашыя вочы. Вось такі нам прысуд, бо здрада ў нашых сэрцах і мана на языках! Такімі мы сталі, рыцары і князі, і хто народзіцца ад нас?»

Трохрадковікі праграміста Валерыя Ягорава маюць афарыстычны характар і разлічаныя на шырокі абсяг чытацкага светапогляду. Зместавая рознапалярнасць радкоў дазваляе ім быць прыцягальнымі. Не ўсё роўна, аднак лепшае заўважнае:

Белы матылёк цэлы дзень
б'ецца ў шыбу
Раніцай ён нарадзіўся
Увечары ён памрэ

Ну і напрыканцы пра найбольш уражлівае. Даўно мне не патраплялася беларуская проза з такім выбітным, амаль класічна-дасканалым стылем, дакладна-загадкавым у апісанні кожнай дробнай дэталі, трапнай да нечакана ўзніклага пачуцця і дарэчнасці думкі... Поўная гармонія і ўзаемаразуменне пануе ў аповедзе Сяргея Вайцкага «Ліхтар» паміж аўтарам і чытачом. І ўсё гэта на меладычным суладдзі чыстакроўнай беларускай мовы. Пра што? Пра нешта і пра ўсё... Пра сыход часу, зменлівасць прасторы, месца і ўспрыманне гэтых працэсаў чалавекам... Рэч сама ў сабе, своеасаблівы псіхааналіз... Нешта паміж Прустам, Пташнікавым і Стральцовым... Сюжэту як такога няма, ёсць удумнае сузіранне, унутраная карціна суперажыванняў, якую хацелася б нанова перапісаць звонку...

«Калі штосьці, укладзенае ў дзіўны, незразумелы спосаб у самае нутро маёй натуры — штосьці трывожлівае, шчыльна павязанае з памяццю і фантазіяй, — час ад часу заклікае да пільнага ўзірання ў рэчаіснасць, у пошуках адзнакаў даўняга, шчаслівага часу, калі ёсць найменшая мажлівасць, хоць бы ва ўяўленні, дазволіць нечаму, лепшаму ўваскрэснуць на момант, пражыць яшчэ некалькі імгненняў жыцця, то ці не варта рызыкнуць? Адсунуўшы ўбок здаровы сэнс, паверыць і даверыцца гэтаму ледзь чутнаму, але выразнаму і настойліваму покліку, захаваць надзею...».

Як на маю думку, у нашу літаратуру ненавязліва стукаецца новы выбітны талент. Хацелася б, каб яго заўважылі.

У часопісе друкуюцца вершы амерыканкі СіДзі Райт у перакладзе В. Гапеевай і паляка Ежы Плютовіча ў перакладзе Ц. Чарнякевіча. Да юбілею Язэпа Драздовіча публікуецца яго малавядомы тэкст «Жыццё на плянэце Сатурне». Таццяна Кабржыцкая піша пра Вацлава Ластоўскага ва ўкраінскім кантэксце. Валянцін Акудовіч згадвае пра гады вучобы ў маскоўскім Літаратурным інстытуце імя М. Горкага. Уладзімір Мароз успамінае пра сваю вандроўку ў Парыж і звязаныя з гэтым акалічнасці. Сяргей Кавалёў разважае пра Таварыства маладых літаратараў «Тутэйшыя», дапаўняючы вядомае сваімі ўласнымі алюзіямі. Алесь Бельскі піша пра сваю калегу і паэтку Любоў Тарасюк. Працягваецца публікацыя ўспамінаў вядомага бібліёграфа Юліі Бібілы. Напрыканцы змешчана рэцэнзія Леаніда Галубовіча на зборнік вершаў С. Брыло «Это буквы». У рубрыцы «Практыкум» — раптоўныя замалёўкі Міхаіла Рубіна. Ну вось такое, да прыкладу: «Ты запісаў цудоўную, прыгожую фразу. А потым яна знікла. Такім чынам, ты запісаў зніканне фразы. Мабыць, гэта і ёсць паэзія». Хоць, прабачаюся, асабіста я замест слова «паэзія» напісаў бы «літаратура»...

Дык чытайма літаратуру, якая можа знікнуць.

ЛеГал

Архіў Восіпа Мандэльштама

Прынстанскі ўніверсітэт (адзін з самых старэйшых і вядомых навучальных устаноў ЗША) выклаў у Сеціве асабісты архіў рускага паэта, пісьменніка, эсэіста і літаратурнага крытыка Восіпа Мандэльштама.



Архіў захоўваецца ў бібліятэцы Firestone ў Аддзеле рэдкіх кніг і спецыяльных калекцый.

У апісанні калекцыі гаворыцца, што яна складаецца з «друкаванай прадукцыі» рукамоўных твораў, рукапісаў, чарнавікоў і перапіскі Мандэльштама.

У шасці скрынках захоўваюцца рукапісныя і надрукаваныя рукапісы яго вершаў, рэцэнзій, артыкулаў і эсэ, часцей у чарнавіках, якія прадстаўляюць розныя этапы працы літаратара. Некаторыя з тэкстаў напісаны рукой яго жонкі Надзеі, якая была і яго памочніцай, і сакратаркай.

Адзін з найвядомых рускіх паэтаў XX стагоддзя, Мандэльштам уваходзіў у групу паэтаў-акмеістаў, сярод якіх былі Ганна Ахматава, Мікалай Гумілёў, Сяргей Гарадзецкі, Міхаіл Зянкевіч, Георгій Іваноў ды іншыя. Ён быў несправядліва абвінавачаны ў антысавецкай агітацыі і трагічна загінуў ад знясілення і хваробы ў перасыльным пункце ва Уладзівастоку, не дажыўшы да свайго 48-годдзя.



Фота www.ponedelnikmag.com

«Пушкін у VK»

Цяпер кожны жадаючы можа «асвяжыць» свае веды па літаратуры ў незвычайнай сацыяльнай сетцы «Пушкін у VK», а зарэгістраваўшыся пад імем аднаго з вялікіх расійскіх пісьменнікаў (Чэхава, Талстога, Астроўскага, Горкага), наогул можна выкладваць пасты ад імя любімага аўтара.

Гэтая досыць арыгінальная сацсетка была створана перамождам Усерасійскага конкурсу маладзёжных праектаў. Праект з назвай «Пушкін у VK» стаў сапраўднай знаходкай для аматараў славеснасці і тым месцам, дзе «ажываюць» класікі рускай літаратуры.

Цяпер кожны карыстальнік інтэрнэту можа выбраць аватар любімага пісьменніка, ад імя якога зможа ствараць пасты, атрымаўшы доступ у асабісты электронны кабінет абранага аўтара. Гэтыя паведамленні могуць быць урыўкамі з лістоў, дзённікаў і твораў літаратара, уключаць фотаздымкі, відэа, інфаграфіку, цытаты.

«Пушкін у VK», як і ўсялякая сацсетка, дазволіць праглядаць «сцяну» іншых пісьменнікаў, пісаць каментары да пастоў і ставіць лайкі. Для прагляду кантэнту рэгістрацыя не патрэбна, аднак калі захочацца пакінуць каментар, паставіць лайк ці нават стварыць пост, то зарэгістравацца неабходна.

У літаратурнай сацыяльнай сетцы існуе яшчэ адна цікавая магчымасць — гэта тэсты. Яны зробяць магчымым адчуць сябе любому ўдзельніку героем знакамітых твораў, да прыкладу, Таццянай Ларынай, Чацкім, Наташай Растовай.

Як адзначыў аўтар «Пушкін у VK», галоўнай мэтай праекта з’яўляецца вяртанне грамадству пяшчотных пачуццяў да рускай славеснасці і аднаўленне цікавасці да біяграфій рускіх класікаў, павелічэнне ахвоты да чытання сапраўдных кніг, а не толькі пастоў у сацсетках.

Вуліца Чынгіза Айтматава

Паводле звестак інфармацыйнага агенцтва «24.kg», у сталіцы Казахстана — Астане — адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця вуліцы імя вядомага пісьменніка Чынгіза Айтматава.

На ўрачыстасцях прынялі ўдзел прэм’ер-міністр Рэспублікі Казахстан Бакытжан Сагінтаеў і прэм’ер-міністр Кыргызстана Мухамедкалый Абылгазіеў.

Прэм’ер Кыргызскай Рэспублікі сказаў, што наданне адной з вуліц Астаны імя вялікага кыргызскага пісьменніка — гэта даніна глыбокай павагі да яго памяці ад казахскага народа і асабіста лідэра краіны Нурсултана Назарбаева. Ён падкрэсліў: «Мы ганарымся, што Чынгіз Айтматаў пакінуў пасля сябе вялікую творчую спадчыну. Яго творы перакладзены на 180 моў свету, і ў кожным кутку нашай планеты ў яго ёсць свой чытач. У гэтым годзе плануецца маштабнае святкаванне 90-годдзя з дня нараджэння Чынгіза Айтматава, у тым ліку ў цюркамоўных краінах, у краінах СНД і Еўропы».

Бакытжан Сагінтаеў адзначыў, што адкрыццё вуліцы імя Чынгіза Айтматава ў Астане ўнясе вялікі ўклад ва ўмацаванне культурных і духоўных сувязяў паміж дзвюма братэрскімі краінамі. «Чынгіз Айтматаў зрабіў вялікі ўклад ва ўмацаванне і развіццё сяброўскіх сувязяў паміж казахскім і кыргызскім народамі. Яго творы блізкія па духу як кыргызам, так і казахам. Ён з’яўляецца тым пісьменнікам, якім могуць ганарыцца абодва нашыя народы», — сказаў прэм’ер-міністр Казахстана.

Было адзначана, што новая вуліца з’яўляецца магістральнай і мае 8 палос руху, да 2020 года яе працягласць дасягне 7,2 км. Яна злучыць гістарычную частку сталіцы з раёнамі новай забудовы.

Чак Паланік і бухгалтар-махляр

Аўтар «Байцоўскага клуба» Чак Паланік даў разгорнутае інтэрв’ю «The Guardian», у якім падрабязна расказаў пра махлярства з яго актывамі, а таксама растлумачыў, чаму страта амаль усіх грошай — гэта «добра».



Фота www.novostilit.ru


Спачатку яго цесць памёр ад раку, потым з’явілася падазрэнне, што даход пісьменніка за апошнія некалькі гадоў быў прысвоены бухгалтарам з яго літаратурнага агенцтва «Donadio & Olson» у Нью-Ёрку. «Падобна, што мой ганарар, прынамсі, за мае апошнія дзве, магчыма, чатыры кнігі, скралі, і таму ў мяне не засталося «рэзерваў», каб пісаць наступную кнігу», — распавёў Чак Паланік. І дадаў: «Грошы, падобна, бралі працяглы перыяд, і пакуль не вядома, колькі было знята і з якіх рахункаў». Цяпер, магчыма, пісьменніку давядзецца прадаць свой дом, каб застацца «на паверхні».

Чак Паланік паведаміў, што яшчэ 15 траўня яго бухгалтара Дарына Уэба, які працаваў у манхэтанскім агенцтве з 2001 года, абвінавацілі ў махлярстве і арыштавалі за падробку дакументаў. 47-гадовага Уэба абвінавачваюць у прысваенні амаль трох з паловай (!) мільёнаў даляраў ЗША. Яму пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 20 гадоў і штраф у памеры 250 тысяч даляраў.

Але сваё складанае фінансавае становішча пісьменнік называе «мілым» («It’s kind of nice»). «Першапачаткова пісьменніцтва было маім спосабам зэканоміць грошы, бо калі вы пішаце, вы іх не марнуеце. Такім чынам, гэта вяртае мяне да пісьменніцтва... — патлумачыў Чак Паланік. — І ёсць усведамленне таго, што я ўсё яшчэ магу вярнуць усё назад і стварыць нешта сапраўды моцнае, яркае і цікавае».

Штучны інтэлект і Шэкспір

Як адзначаецца ў паведамленні індыйскага выдання «Dailyexcelsior», навукоўцы з Універсітэта Таронта, Мельбурна і аўстралійскага філіяла IBM «навучылі» штучны інтэлект генераваць санеты ў стылі вялікага ангельскага драматурга і паэта Уільяма Шэкспіра.



Нейронную сетку, якая піша пяцістопным ямбам з націскам на другім складзе ў стылі класіка брытанскай літаратуры, навукоўцы вырашылі назваць Deepspeare. Прааналізаваўшы 2,7 тысячы санетаў паэта з свабоднай электроннай бібліятэкі, штучны інтэлект навучыўся ствараць уласныя паэтычныя радкі, пры гэтым прытрымліваючыся стылю Шэкспіра.

Эксперты ў галіне англійскай літаратуры, якія вывучалі санеты нейрасеціва, нават адзначылі, што некаторыя тэксты машыны атрымаліся лепшымі, чым у вялікага паэта, паколькі штучны інтэлект больш дакладна трымаецца памеру пяцістопнага ямба, а таксама дакладней падбірае рыфмы. У той жа час навукоўцы прызналі, што ў машыны маюцца праблемы з сэнсам і «піша» яна яшчэ з граматычнымі памылкамі. Таму да Шэкспіра нейрасеціву Deepspeare яшчэ насамрэч далёка.

Аднак у любым выпадку вынаходніцтва навукоўцаў вартае ўвагі, паколькі палова экспертаў, якія ацэньвалі працу штучнага інтэлекту, не змаглі адрозніць арыгінальныя радкі ад кампутарнай версіі. Адзін са стваральнікаў машыны — навуковец Адам Хэмонд — сцвярджае, што цяпер яна зможа рабіць тэксты больш пісьменнымі і чытэльнымі, бо ўсе недахопы вядомыя.

Літаратурная Беларусь

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by